ЦАНА НУМАРА

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дарموvым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх. тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасля тэксту—50 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Паскрод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаванні—скідка. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. сярэдца 10 проц. надбаўку.

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

Сакратар . . . 10-74
Сакратар . . . 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

ПЯТНІЦА, 26 верасьня 1930 г.
№ 225 (3823)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

„Да канца пяцігодкі калектывізацыя СССР у асноўным павінна быць закончана" (СТАЛІН).

АРГАНІЗУЙЦЕ новы калгасны прыліў

БЯЗЬЛІТАСНАЯ ВАЙНА ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАМУ САМАЦЁКУ

Будзьце бальшавіцкімі арганізатарамі новага ўздыму суцэльнае калектывізацыі, змагайцеся за заўтрашняга калгасьніка.

СУРОВЫ АДПОР КУЛАКУ І ЯГО АГЕНТУРЫ---ПРАВЫМ АПАРТУНІСТ

Больш клясавай пільнасьці!

Караючы меч пралетарскай дыктатуры апусьціўся на галовы выкрытых АДПУ шкоднікаў — контр-рэвалюцыянэраў, якія прабавалі кастлявай рукой голаду задушыць мільёны пралетараў, іх жонак і дзяцей.

Клясавае змаганьне ў нашым краі працягваецца і абвастраецца. Толькі апартуністы, толькі той, хто нічога не разумее ў ленінізьме, мог думаць, што абшарніцка-капіталістычныя рэшткі і верхавіна буржуазнай інтэлігенцыі прымірацца з фактам існаваньня пралетарскай дыктатуры і дадуць нам магчымасьць спакойна будаваць сацыялізм.

Яшчэ дванаццаць год таму назад Уладзімер Ільліч з усёй выразнасьцю прадугледжваў шалёнае супраціўленьне рэштак эксплёататарскіх клясаў.

«Пасьля першага сур'ёзнага паражэньня скінутыя эксплёататары, якія не чакалі свайго ізрынуцьця, ня верылі ў яго, не дапускалі думкі пра гэта, з яшчэ большай энэргіяй, з шалёнай палкасьцю, з нянавісьцю, узросшай у сто разоў кідаюцца ў бой, за зварот адабранага «раю», за іх сем'і, якія жылі так соладка і якіх цяпер «простанародная сволач» асуджвае на эрыйнаваньне і галечу (або на «простую» працу...)» (Ленін).

У грамадзянскай вайне мы разьбілі клясы памешчыкаў і капіталістых. Гіганцкімі намаганьнямі рабочая кляса пад кіраўніцтвам ленінскай партыі адбудавала зьнішчаную народную гаспадарку і дасягнула вялізарнейшых посьпехаў у напрамку яе рэканструкцыі па новых сацыялістычных пачатках, СССР зьяўляецца адзінай квітнеючай краінай. Капіталістычны сьвет душыцца ў канвульсіях крызісу.

На аснове посьпехаў, якіх мы дасягнулі ў галіне індустрыялізацыі нашае краіны, у першую чаргу на аснове посьпехаў у галіне машынабудаўніцтва, металюргіі, мы здолелі шчыльна падысьці да праблемы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Мы падыйшлі да таго пэрыяду, ільліч гаварыў, мы дабіліся вызначуваных у гісторыі тэмпаў разьвіцьця. Асноўныя масы сялянства ўступілі на шлях сацыялізму. На аснове суцэльнай калектывізацыі мы перайшлі да ліквідацыі апошняй капіталістычнай клясы ў нашай краіне—кулацтва.

Але ні кулак, ні рэшткі пануючых раней клясаў не здаюцца. Пацярпеўшы паражэньне ў радзе адкрытых схватак, вораг прабуе ўсякімі спосабамі перашкодзіць нашаму руху наперад, дэзарганізаваць наша гаспадарчае будаўніцтва. Энтузіязму рабочае клясы і яе самаадданай рабоце на сацыялістычных фабрыках і заводах, клясавы вораг проціпастаўляе шкодніцкія арганізацыі.

Гэтыя контр-рэвалюцыйныя шкодніцкія арганізацыі прадстаўляюць сабой павучальны малюнак. Мы тут маем адзіны згуртаваны блок, пачынаючы ад ангельскага фунта, былых буйных прамыслоўцаў і фінансістых і канчаючы сацыял-шкоднікамі, меншавікамі і эсэрамі. Мы тут маем фронт клясавых ворагаў усіх нацыянальнасьцяй.

Шкодніцтва, якое зьяўляецца адной з форм супраціўленьня клясавых ворагаў супроць наступленьня сацыялізму, спэкулявала на тых труднасьцях росту, якія мы перажываем. Контр-рэвалюцыянэры і шкоднікі абвастраюць гэтыя труднасьці. «За нашымі труднасьцямі хаваюцца нашы клясавыя ворагі, труднасьці гэтыя ўскладняюцца распачлівым супраціўленьнем аджываючых клясаў нашае краіны, падтрыманьнем гэтых клясаў звонку, наяўнасьцю бюракратычных элемэнтаў у нашых уласных установах, наяўнасьцю няўпэўненасьці і ўскоснасьці ў некаторых праслойках нашае партыі» (Сталін).

Характэрна, што контр-рэвалюцыянэры-шкоднікі дзейнічалі якраз у тых галінах прамысловасьці, якія зьяўляюцца найбольш вузкімі месцамі ў нашай народнай гаспадарцы: у ляляровай мэталюргіі, у машынабудаўніцтве, мясной справе, агароднай справе і г. д.

Цікавым зьяўляецца той бок вывадаў, якія павінен быць зроблены, гэта тое, што яны выяўляюць, хто стаяў і стаіць за сьпіной правых апартуністых, і да чаго прывяла-б перамога правых апартуністых у радох нашай партыі. Правыя апартуністыя выстаўлялі супроць партыі зброю з арсэналу Кандрацьева і Громана. Правыя апартуністыя прапанавалі партыі браць стаўку на разьвіцьцё кулацкіх элемэнтаў, паўтараючы Кандрацьева, які прапанаваў разьвязаць вытворчыя сілы «мацнеючых пластоў вёскі», правыя апартуністыя паўтаралі словы гэтых буржуазных рэстаўратараў аб тым, што адзіным выйсьцем з хлебных труднасьцяй і адзіным шляхам для вырашэньня збожжавай праблемы — зьяўляецца разьвіцьцё адзінаасобных гаспадарак.

Кандрацьевы і Громаны, якія займаліся контр-рэвалюцыйным шкодніцтвам у органах плянаваньня, прапаведвалі тэорыю «абмежаваньня тэмпаў прамысловага капітальнага будаўніцтва», прапанавалі разьвіваць у першую чаргу лёгкую прамысловасьць. Правыя апартуністыя, на чале з былым лідэрам правай апазыцыі — Бухарыным, фактычна падтрымалі гэтым шкоднікам на матыў «аб непасільнасьці тэмпаў».

Штодзенна мы ў «Зьвязьдзе» зьмяшчаем факты праваапартуністычнай практыкі, якая праводзіцца па асобных мясцох, як арыентыроўка на самацёк у правядзеньні калектывізацыі, настрої аб немагчымасьці выкананьня прамфінпляну на прадпрыемстве і г. д. Чым іншым зьяўляецца гэта праваапартуністычная практыка, калі не работай у духу контр-рэвалюцыйнай ідэалёгіі Кандрацьевых і Громанаў?

Як ужо вядома (гл. факты, паданыя ў дакладзе тав. Галадзеда на сходзе інжынэраў і тэхнікаў у сакавіку г. г.), контр-рэвалюцыйныя нацыянал-дэмакраты ў нас, у БССР імкнуліся праводзіць свае шкодніцкія пляны. Нацыянал-дэмакратычная контр-рэвалюцыя брала курс на рэстаўрацыю капіталізму ў БССР, а нацыянал-апартуністыя ў радох КП(б)Б зьяўляліся і зьяўляюцца рупарам гэтых нацыянал-дэмакратычных контр-рэвалюцыянэраў і шкоднікаў.

Верны вартаўнік пралетарскай дыктатуры — АДПУ пры актыўнейшай садзейнасьці найпшырэйшых мас працоўных выкрывае шкодніцкія арганізацыі. Пралетарыят не правяць ніякай літасьці да гэтых платных агентаў міжнароднага капіталу.

Бязьлітасна распраўляючыся з контр-рэвалюцыянэрамі - шкоднікамі, працягваючы бязьлітаснае змаганьне на два франты з правым ухілам, галоўнай небясьпекай, «левымі» загібамі і нацыянал-апартунізмам у сваіх радох, — партыя давядзе сацыялістычнае наступленьне да пераможнага канца.

СТАЦЬ НА ЧАЛЕ РУХУ МАС

Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) у сваёй адозьве паставіў перад партыяй і рабочай клясай задачу гіганцкага гістарычнага значэньня: **забясьпечыць у другім годзе пяцігодкі пераход ня менш, як 50 проц. сялянскіх аспадарак на сацыялістычны шлях, на шлях калектывізацыі.**

На поўнае ажыцьцяўленьне гэтай задачы павінны быць кінуты ўсе нашы сілы, павінна быць мабілізавана ўся наша настойлівасьць і энэргія. Партыйная ячэйка на вёсцы павінна стаць бальшавіцкім арганізатарам калгаснага прыліву, стаць на чале руху бяднякаса-рэдняцкіх мас у калектывы.

Толькі з усёй бальшавіцкай настойлівасьцю, з дня ў дзень арганізуючы новы калгасны прыліў, партыйныя арганізацыі забясьпечаць новы ўздым калгаснага будаўніцтва, новае яшчэ больш магутнае і шырокае разгортваньне суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыю кулацтва, як клясы на гэтай аснове.

Прыходзіцца канстатаваць, што шмат якія раённыя арганізацыі пальцам не кранулі, каб арганізаваць калгасны прыліў, каб стаць на чале руху ў калгасы. Асобныя арганізацыі сталі сьпіной да калгаснага прыліву, узялі стаўку на самацёк, не праводзяць ніякай работы на далейшай калектывізацыі. Пасьпяшаньць і бязадзейнасьць у змаганьні за адзінаасобніка — заўтрашняга калгасьніка, за новы калгасны прыліў — самая шкодная правая правага апартунізму на практыцы. Факты, якія надаюцца ў карэспандэнцыі з Багушэўскага раёну, добра паказваюць, куды прыводзіць праваапартуністычная стаўка на самацёк, злачынная бязьдзейнасьць у змаганьні за калектывізацыю. Багушэўскае партыйна-савецкае кіраўніцтва, якое давярыла калгасы апартуністым, а само маўкліва назірала, як у раёне развальваюцца арцелі, павінна быць рашуча **аздароўлена.** Бязьлітасная вайна ўсякаму праваапартуністычнаму самацёку. Мацней удар па кулаку і яго праваапартуністычнай агентуры.

Шырэй фронт змаганьня за новы калгасны прыліў! Партыйныя арганізацыі мабілізуйце ўсе свае сілы, каб дабіцца новага ўздыму суцэльнай калектывізацыі, сыстэматычна і ўпарта арганізуйце прыліў у калгасы Кенгасы, на вышках сваёй калектыўнай работы, на канкрэтных фактах калгаснага жыцьця пераконвайце адзінаасобніка ў перавазе калектывізацыі, упятвайце адзінаасобнікаў у свае рады!

Мы маем ужо прыклады гэраічнай работы па арганізацыі калгаснага прыліву. Мы маем факты, калі новыя калгасы, якія ўсім нядаўна арганізаваліся, пабальшаюцца скончылі асеньнюю сяўбу (калгасы імя **XVI зьезду УсеКП(б), «Бальшавік»** і г. д.). Даб'емся, каб такіх прыкладаў можна было падаць сотні і тысячы. Даб'емся ў дзень ударніка, дзень уражаю і калектывізацыі **новага магутнага ўздыму калгаснага руху.**

ДЗЬВЕРЫ ЗАЧЫНЕНЫ

Правыя апартуністыя зрываюць калгасны прыліў

БАГУШЭЎСКАЯ. (Наш спэцкар). У Багушэўскім раёне не праводзіцца **НІЯКАЕ РАБОТЫ** па арганізацыі калгаснага прыліву. Раённае партыйна-савецкае кіраўніцтва ўзяло праваапартуністычную стаўку на самацёк і вярнулася сьпіной да калгаснага прыліву. І райком партыі, і Райвыканком не аддаюць патрэбнай увагі калектывізацыі.

Усё кіраўніцтва калгасамі было сканцэнтравана ў руках раённага Малжывсаюзу, які на практыцы праводзіў лінію правага апартунізму. Малжывсаюз фактычна тармозіў калектывізацыю і спрыяў разбурэньню калгасу. Праваапартуністычная практыка Малжывсаюзу, на якую не рэагавала раённае партыйна-савецкае кіраўніцтва, прывяла да скарачэньня калектывізаванай плошчы. Усякі далейшы рост калгасаў зусім спыніўся. У раёне калгасы арганізацыйна і гаспадарча не замацаваны. Арганізацыя працы, за выключэньнем арцелі «Чырвоны бераг», у калгасах пастаўлена зусім дрэнна. Характэрна, што старшыня Малжывсаюзу ЛІГАРОЎ, пад кіраўніцтвам якога зрывалася калектывізацыя ў раёне, адкрыта заяўляе, што ён «ня мае схільнасьці кіраваць нейкімі там калгасамі».

Райком партыі, замест барацьбы з праваапартуністычнай практыкай Малжывсаюзу, займае яўна прымірэнчую пазыцыю. Зараз Лігароў назначаны старшынёй нядаўна арганізаванага Райкаапсаюзу, які працягвае старую апартуністычную лінію Малжывсаюзу.

Становішча, якое стварылася, больш чым сур'ёзнае. Калгасы пакінуты без усякага кіраўніцтва. Перад адзінаасобнікамі дзьверы калгасаў зачынены. Патрабуем рашучых мер. Трэба ЗЬНЯЦЬ З РАБОТЫ апартуністычнае кіраўніцтва Райкаапсаюзу і сурова ўдарыць па прымірэнцах з раённага камітэту партыі.

Я. ФАЛЬКО.

У партыю, у калектыў

ДРЫСА. (Наш кар.). Пагроза правалу ўборкі тэхнічных культур **ліквідавана.** Пад кіраўніцтвам райкому партыі ільнаводныя калгасы і адзінаасобнікі амаль цалкам убралі лён. На 20 верасьня на раёне лён убраны на **95 проц.**

Асобныя калгасы, якія паказалі ўзор баявой выразнай работы, заключалі з адзінаасобнікамі дагавары на ўзаемную дапамогу ў ліквідацыі прарыву ва ўборцы тэхнічных культур. Калгас імя **Будзённага,** напрыклад, заключыў узаемны дагавор з адзінаасобнікамі і аб'яднаньнямі сіламі ўбраў увесь лён. У калгасе створаны ўдарныя брыгады, якія па-баявому працавалі на ўборцы ільну. Працоўны энтузіязм калгасьнікаў зрабіў вялікае ўражаньне на адзінаасобнікаў. У адным імя Будзённага ўступіла 12 адзінаасобных бяднякаса-рэдняцкіх гаспадарак.

Перадавыя калгасы раёну наладзілі масавае абмеркаваньне разам з адзінаасобнікамі верасьнёўскай адозвы ЦК УсеКП(б). На адозву ЦК адзінаасобнікі адказваюць новымі заявамі аб прыёме ў калгасы. Асабліва добра з вялікім уздымам прайшло абмеркаваньне адозвы ЦК у калгасе **«Ленінскі Шлях». У часе абмеркаваньня 8 бяднякаса-рэдняцкіх адзінак асобных гаспадарак уступіла ў калгас. 5 лепшых калгасьнікаў падалі калектыўную заяву аб прыёме ў КП(б)Б.**

КУРГАН.

Хроніка калгаснага прыліву

На **Меншчыне** заўважаецца новы прыліў у калгасы. Асноўная прычына прыліву—папулярызацыя пастановы XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б), посьпехі шмат якіх калгасаў па ўборцы ўраджаю і асеньняй сяўбе і г. д. Калгас **«Намінтэрн»,** Плешчаніцкага раёну за апошні час вырас на 14 адзінаасобных бяднякаса-рэдняцкіх гаспадарак. У Заслаўскім раёне арганізаваны **новы** калгас, які яднае некалькі дзесяткаў гаспадарак. У існуючыя калгасы раёну ўступіла **34** бяднякаса-рэдняцкіх гаспадарак. У Вягомльскім раёне пасьля папулярызацыі пастановы XVI партызезду і абмеркаваньня рэгоргрэйкай [illegible]

ЦК УсеКП(б) арганізаваны **рад новых** калгасаў, якія яднаюць каля **200** бяднякаса-рэдняцкіх гаспадарак. Арганізаваны новы калгас у вёсцы Дворышча, Прыгараднага сельсавету (Менск).

* * *

Прыліў у калгасы **Магілеўшчыны** пашыраецца з кожным днём. На Шклоўшчыне і Клімаўшчыне арганізавана **7** новых калгасаў, у якія ўступіла амаль **500** адзінаасобных бяднякаса-рэдняцкіх гаспадарак. Асабліва вялікі прыліў заўважаецца ў калгасах **«Камунар Магілеўшчыны», «Ленінскі Шлях», «Ленінская Ніва», «Іскра»,**

Дзень ураджаю і калектывізацыі

сустрэнем новымі сотнямі калгасаў

ДА ЎСІХ РАБОЧЫХ САЎГАСАЎ, КАЛГАСЬНІКАЎ, БЕДНАТЫ, І СЕРАДНЯЦТВА БС

З адозвы НКЗ БССР і Белкалгасцэнтру

ТАВАРЫШЫ!

Надыходзіць «Дзень ураджаю і калектывізацыі», дзень падагульненьня дасягнутых посьпехаў у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, у наступленьні на капіталістычныя элемэнты і выкарчоўваньні карэньняў капіталізму.

РУЙНУЮЧЫ АДПОР КУЛАКУ

Папярэднія вынікі калектыўнае працы, падагуленыя ў вялікай колькасьці калгасаў БССР, сьведчаць аб тым, што кожная гаспадарка, якая ўвайшла ў калгас, як правіла атрымлівае **БОЛЬШЫ ПРЫБЫТАК,** чым мелі гэтыя гаспадаркі раней ад сваіх дробных, адзінаасобных.

Вось чаму наш клясавы вораг—кулацтва і інш. ворагі сацыялістычнага будаўніцтва ўсімі сіламі і сродкамі імкнуцца перашкодзіць далейшаму калгаснаму руху.

Кулацтва добра разумее, што суцэльная калектывізацыя нясе ліквідацыю яго (кулацтва), як клясы. Таму кулацтва аказвае шалёнае супраціўленьне нашаму сацыялістычнаму наступленьню. Яшчэ мацней разгорнем бязьлітасную барацьбу з клясавым ворагам-кулацтвам.

ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ

Таварышы—калгасьнікі, адзінаасобнікі—беднякі і сераднякі! Рабочая кляса БССР, [illegible] і ўсяго Савецкага Саюзу, на зьездзе [illegible] УсеКП(б) з пачуваньнем энэргіяй і творчым энтузіязмам разгарнула работу па сканчэньні другога году пяцігодкі, каб забясьпечыць поўнае выкананьне трэцяга году пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва.

Тэмпы далейшага разгортваньня прамысловасьці і індустрыялізацыі краіны, ад чаго залежыць большае і лепшае забясьпячэньне сельскае гаспадаркі машынамі, прамтаварамі і г. д., могуць быць яшчэ **больш высокімі,** калі сельская гаспадарка, у першую чаргу сацыялістычны сэктар—саўгасы і калгасы, **своячасова і поўнасьцю выканае** свой прамфінплян, пляны засеву тэхнічных культур, разьвіцьця жывёлагадоўлі, асабліва сьвінагадоўлі і г. д.

Між тым, саўгасы і калгасы прыходзяць да дня ўраджаю і калектывізацыі са **значнымі прарывамі** ў выкананьні раду важнейшых заданьняў партыі і ўраду ў галіне сельскай гаспадаркі.

З ПАДВОЙНАЙ ЭНЭРГІЯЙ ЗА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВАЎ

Найбольш небясьпечнымі прарывамі зьяўляюцца: слабы тэмп асеньняй сяўбы, недапушчальны марудны ход уборкі ўраджаю, асабліва тэхнічных культур, вельмі дрэнна выконваюцца пляны камплектаваньня, спэцыялізаваных малочных жывёлагадоўчых, сьвінаводных калгасаў і саўгасаў; слаба вядзецца гаспадарчае будаўніцтва; нікуды ня варта работа па сіласаваньні.

Непоўнае выкананьне плянаў і заданьняў па сельскай гаспадарцы паслабляе нашы сілы і па сутнасьці дапамагае клясаваму ворагу—кулацтву ў яго барацьбе супроць нас, супроць саўгасаў і калгасаў, а гэтым самым супроць беднаты і серадняцтва.

Таварышы рабочыя калгасаў, калгасьнікі і адзінаасобнікі—беднякі і сераднякі! Мы заклікаем вас а падвойнай энэргіяй, з усёй бальшавіцкай рашучасьцю безадкладна разгарнуць падрыхтоўку да дня ўраджаю і калектывізацыі на аснове рэалізацыі адозвы ЦК УсеКП(б) пад лёзунгамі:

— За далейшае разгортваньне калектывізацыі бяднякаса-серадняцкіх гаспадарак БССР усіх нацыянальнасьцяй. За суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю кулацтва, як клясы на гэтай аснове.

— За правільную арганізацыю працы ў калгасе. За поўнае выкананьне да вызначаных тэрмінаў плянаў сяўбы, сіласаваньня, камплектаваньня жывёлагадоўчых і сьвінаводных саўгасаў і калгасаў.

— За абавязкова поўнае выкананьне плянаў хлебазагатовак, за поўную ўборку тэхнічных культур і бульбы.

У КАЛГАСЫ—НОВЫЯ ТЫСЯЧЫ ЗАЎТРАШНІХ КАЛГАСЬНІКАЎ

— Узьнімем ініцыятыву калгасьнікаў, адзінаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў на мабілізацыю грашовых сродкаў для пасканчэньня тэмпаў індустрыялізацыі краіны, для справы будаўніцтва заводаў с-г. машын, шляхам поўнага абору паёў, рэалізацыі трактарных і аўтамабільных абавязацельстваў, акцый Трактарацэнтру, павялічэньняў укладаў у ашчадкасы і г. д.

Леніным і нашчэйшым ударам па клясавым ворагу—па кулаку будзе зьяўляцца арганізацыя новых калгасаў, уцягненьне бяднякаса-серадняцкіх гаспадарак у існуючыя калектывы, поўнае сканчэньне ўборкі, сяўбы, сіласаваньня і арганізацыі жывёлагадоўчых гаспадарак, устанаўленьне правільных узаемаадносін паміж калгасьнікамі і адзінаасобнікамі.

Таварышы—рабочыя саўгасаў, калгасьнікі! Разгорнем пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый бальшавіцкімі тэмпамі работу сярод адзінаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў, за далейшае разгортваньне калектывізацыі, за вытворчае каапэраваньне.

Сустрэнем дзень ураджаю і калектывізацыі сотнямі новых калгасаў, дзесяткамі тысяч калектывізаваных, [illegible] ваных бяднякаса-серадняцкіх [illegible] рак.

Поўнасьцю выканаем да дня [illegible] і калектывізацыі пляны [illegible] выканаем свае абавязкі перад [illegible] скай дзяржавай. Ні аднаго кілаграма лішкаў прыватніку. Своячасова і поўнасьцю выконваючы пляны загатовак, будзем паляпшаць забясьпячэньне рабочых цэнтраў, а гэтым самым паскараць тэмпы будаўніцтва сацыялізму.

Дзень ураджаю і калектывізацыі павінен зьявіцца днём магутнага разгортваньня руху сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва за бальш[illegible] тэмпы работы.

Правядзем шырокую справаздачасьць саўгасаў і калгасаў перад [illegible] наасобнікамі—беднякамі і серадняк[illegible] праз сходы, выстаўкі і г. д.

Таварышы адзінаасобнікі—беднякі і сераднякі! Вы на практыцы, на вышках першага году работы калгасаў бачылі перавагу калектыўнай гаспадаркі над дробнай, індывідуальнай. Для таго, каб хутчэй забясьпечыць сапраўдны ўздым сельскае гаспадаркі, паленьнем свае матар'яльнае становішча, пазбавіцца ад свайго заядлага ворага-кулака, хутчэй арганізуйце новыя калгасы, устаўляйце і арганізуйце вытворчыя таварыствы.

Таварышы—25.000-кі! Вы ўжо [illegible] вялізарную практычную дапамогу ў замацаваньні дасягнутых посьпехаў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Падвойце вашу энэргію [illegible] за далейшае разгортваньне калектывізацыі за далейшыя яшчэ больш высокія клясныя паказальнікі калектыўнай працы!

ГЕНЭРАЛЬН[illegible] І НЕДАХОПАЎ

Таварышы рабочыя саўгасаў, калгасьнікі—25-ці тысячнікі! А[illegible] магутны руйнуючы адпор кулацтву. Дзень 14 кастрычніка, замест [illegible] ігінага сьвята, ператорым у генэральны агляд нашых дасягненьняў і недахопаў у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Зробім яго днём праверкі [illegible] наньня аграмінімуму, днём шырокай [illegible] білізацыі мас калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў на далейшае разгортваньне сацыялістычнае рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, на рашучае [illegible] на капіталістычныя элементы.

Няхай жыве камуністы[illegible] арганізатар і кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва.

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б наперад [illegible] новых перамог, па шляху сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Народны Камісар Земляробства БССР РАЧЫЦКІ.

Старшыня Белкалгасцэнтру С. МІЦЬКЕВІЧ.

Прэміяваць лепшыя прадпрыемствы, ударныя брыгады і асобных ударнікаў

Пастанова прэзыдыуму УсеЦСПС і ВСНГ

МАСКВА, 25. Для заахвочваньня лепшых прадпрыемстваў, брыгад і ўдарнікаў прэзыдыум УсеЦСПС і ВСНГ пастанавіў:

Прадставіць усесаюзнаму прэміяваньню рад лепшых прадпрыемстваў, ударных брыгад і асобных ударнікаў, дырэктароў і інжынэрна-тэхнічных работнікаў. Вызначыць наступныя віды прэміяваньня: а) Для прадпрыемстваў—будаўніцтва жыльёвых дамоў для рабочых, пабудова клюбу, сталоўкі, фабрычнікухні, ясьлей, дзіцячага гарадка, бань, прачкарні, спорт-пляцоваў, тэх-станцый, базы для адпачынку і г. д. б) Для ударных брыгад і асобных ударнікаў—прадстаўленьне да ўзнагароды ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага сьцягу і пасылкі за границу для павышэньня кваліфікацыі.

Прэміраваньне прадпрыемстваў павінна пайсьці за кошт уключэньня спэцсродкаў у кантрольныя лічбы на 1931 год, для чаго асыгнаваць спэцыяльна 80 мільёнаў рублёў. Авансаваць ня менш 20 проц. гэтых сродкаў для прэміяваньня прадпрыемстваў у 1930 годзе.

Пры адборы прадпрыемстваў, ударных брыгад і ўдарнікаў для ўсесаюзнага прэміяваньня кіравацца наступнымі асноўнымі палажэньнямі: а) Перавыкананьне гадавога пляну па ўсіх паказальніках, асабліва па зьніжэньні сабекошту і паляпшэньні якасьці прадукцыі. б) Ініцыятыва ў разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, у стварэньні новых форм сацыялістычнай арганізацыі працы (грамадзкі буксір, «сквозные» брыгады, вытворчыя калектывы і г. д.). Ступень ахопу спаборніцтвам і ўдарніцтвам рабочых, канкрэтызацыя дагавораў, давядзеньне прамфінпляну да цэху і вытворчых заданьняў да асобнага рабочага, пастаноўка ўліку работы і інфармацыі рабочых аб ходзе выкананьня заданьня. в) Роля прадпрыемстваў у перабудове дзяржапарату, калектывізацыі сельскае гаспадаркі, у паляпшэньні работы каапэрацыі, у арганізацыі рабочага забясьпячэньня і г. д.

Для ўдарных брыгад і ўдарнікаў дадаткова павінны ўлічвацца іх удзел у грамадзка-палітычным жыцьці прадпрыемства (вытворчая нарада, разьвіцьцё рацыяналізацыі і вынаходніцтва, у перабудове прафсаюзнай работы), іх арганізатарская роля ў разьвіцьці сацспаборніцтва і ў ахопе рабочых ударным рухам. Апрача таго, аб'яднаньнем трэсту і прадпрыемствам правесьці прэміраваньне асобных ударных брыгад і ўдарнікаў з існуючых пры гаспадарчых органах фондаў прэміраваньня за дасягненьні па сацспаборніцтве для чаго вызначаны наступныя віды прэмій: а) для УДАРНЫХ БРЫГАД—вытворчая экскурсія па СССР (Днепрабуд, Турксіб, Магнітагорск і г. д.), дні адпачынку, набыцьцё вэлёсыпэдаў і г. д. б) ДЛЯ ЎДАРНІКАЎ—пасылка на вучобу з гаспадарчымі стыпэндыямі (прамакадэмія, БТНУ і інш.), загранічныя камандыроўкі і пасылкі на заводы СССР для павышэньня кваліфікацыі, пасылка ў дамы адпачынку, набыцьцё бібліятэк марксыцка-ленінскай і навукова-тэхнічнай літаратуры.

З сёнешнім нумарам газ. „Зьвязда" ўсім падпісчыкам рассылаецца дармовы дадатак—газ. „ПРАФРУХ" № 24.

У апошні месяц „Прафрух" па тэхнічных прычынах ня выходзіў.

Пачынаючы з сёнешняга дня, „ПРАФРУХ" зноў будзе выходзіць рэгулярна.

У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

НОВЫЯ ПЛЁТКІ АБ ПАЛЯНСКІМ

РЫХТУЕЦЦА НОВЫ ТРУК

ВАРШАВА, 23. Гісторыя з Янам Палянскім прыняла новы абарот. Польская буржуазная прэса падае, што Палянскі 22 вечарам даставілен у Варшаву і зьмешчаны ў арыштным памяшканьні крымінальна-сьледчай паліцыі. У сувязі з дзіўнымі мэтамарфозамі, якія ня спыняюцца з Палянскім, карэспандэнт ТАСС навёў спраўкі у афіцыйных колах, якія пацьвердзілі, што **Палянскі на гэты раз сапраўды даставілен у Варшаву.**

Характэрна, што сёньня ў ход пушчана новая вэрсія. Кракаўскі «Ілюстраваны Кур'ер Цодзенны» паведамляе, што Палянскі па дарозе ў Варшаву прызнаўся суправаджаўшаму яго паліцэйскаму камісару Шынкману, што ён сапраўды зрабіў замах на савецкае паўпрэдзтва ў Варшаве. Пры гэтым Палянскі, — паведамляе далей «Кур'ер Ілюстраваны», — даваў надавычай нявыразныя адказы адносна свайго паходжаньня, сьцьвярджаючы, што хаця ён і нарадзіўся ў Чэрнівіцах і зьяўляецца нібыта румынскім грамадзянінам, але ён мог-бы таксама давесьці, што ён зьяўляецца і польскім грамадзянінам з Усходняй Галіцыі (Зах. Украіна). «Кур'ер Ілюстраваны» адпачасова заяўляе, быццам-бы ў паліцыі ва Ўсходняй Галіцыі ёсьць паказаньні на сувязь Палянскага з нейкімі «камуністымі».

Трэба чакаць, што праз 2 дні Палянскі наогул «зьявіцца» выдатнейшым членам кампартыі, які прабаваў узарваць савецкае паўнамоцнае прадстаўніцтва па яе даручэньні. Гэты варыянт, відавочна, павінен замяніць няўдалую румынскую вэрсію.

ЗАКРЫЦЬЦЕ ДРУКАРАНЬ «АПАЗЫЦЫЙНЫХ» ГАЗЭТ

ВАРШАВА, 24. Адміністрацыйныя ўлады Варшавы апячаталі друкарню правых апазыцыйных газэт «АВЦ» і «Вечар Варшавскі» пад прадлогам, што «друкаваньне і экспедыцыя газэт парушаюць спакой кватарантаў дому». Друкарня знаходзіцца ў гэтым доме ўжо

Турэцкі міністар замежных спраў Тэўфік Рушдзі-бэй у Маскве

СУСТРЭЧА ТЭЎФІК РУШДЗІ-БЭЯ НА ВАКЗАЛЕ

БАНКЕТ У НАРКАМАЦЕ ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ У ГОНАР ТУРЭЦКАГА МІНІСТРА

МАСКВА. 24 верасьня ў Маскву прыехаў турэцкі міністар замежных спраў п. Тэўфік Рушдзі-бэй. На вакзале п. Тэўфік Рушдзі-бэй быў спатканы наркомам замежных спраў тав. **Літвінавым,** нам. наркома замежных спраў тав. **Караханам,** нам. наркамгандлю СССР тав. **Хлопляніным,** старшынёю РОСТА тав. **Пятровым,** загадчыкам [illegible] аддзелам Наркамгандлю тав. Пас[illegible], загадчыкам пратакольным [illegible] камату замежных спраў тав. Фёдорынскім, адказнымі супрацоўнікамі Наркомату замежных спраў, турэцкім пасольствам, старшынямі турэцкай калоніі ў Маскве і прадстаўнікамі друку.

Савецка-турэцкая прыязьнь усё больш умацоўваецца

ЗАЯВА ТЭЎФІК РУШДЗІ-БЭЯ ПРАДСТАЎНІКУ ТАСС

МАСКВА. 24 верасьня міністар замежных спраў Турцыі Тэўфік Рушдзі-бэй прыняў прадстаўніка ТАСС. У гутарцы з прадстаўніком міністар замежных спраў Турцыі заявіў:

— Савецка-турэцкая прыязьнь разьвіваецца самым натуральным чынам. У працесе разьвіцьця падзей гэта прыязьнь яшчэ больш умацоўваецца.

На пытаньне: у якой меры адаб'ецца на зьнешняй палітыцы Турцыі стварэньне новай, апазыцыйнай партыі, п. міністар даў наступны адказ: «зьнешняя палітыка, якая праводзіцца Турцыяй, да гэтага часу ідзе па шляхах, паказаных нашым вялікім правадыром Газі Мустафам-Кемалем і вялікім нацыянальным сходам. Урад Ісмэт-Пашы ў сваёй зьнешняй палітыцы ішоў і будзе ісьці па гэтым шляху.

На пытаньне, як адносіцца Турцыя да ідэі пан-Эўропы, — пан міністар заявіў: гэта пытаньне ня цікавіць нас ні ў адносінах.

У далейшай гутарцы п. міністар казаў глыбокую радасьць, што 9 год зноў мае магчымасьць бы[illegible] Маскве, вялікай сталіцы народаў нага Саюзу. (ТАСС).

* * *

МАСКВА, 24. Учора а 2-й гадзіне турэцкі міністар замежных спраў Тэўфік Рушдзі-бэй быў на сн[illegible] у наркома замежных спраў СССР тав. **М. М. Літвінава.** А 4 гадз. дня Тэўфік Рушдзі-бэй быў прыняты старшынёю СНК СССР тав. **А. І. Рыкавым.**

5-га кастрычніка г. г., а 12 гадз. дня, у памяшканьні ЦК КП(б)Б (вялікая заля), адбудзецца

ПЛЕНУМ ЦК КП(б)Б

з наступным парадкам дня:

1. **Аб чарговых гаспадарчых задачах.**
2. **Аб узмацненьні раёнаў у зьвязку з ліквідацыяй акруг.**
3. **Аб чарговых задачах нацпалітыкі.**

На пленум запрашаюцца члены і кандыдаты ЦК КП(б)Б, рэвіз. камісіі і сакратары Гаркомаў і Райкомаў КП(б)Б.

Па-бальшавіцку праводзіць ленінскую нацпалітыку!

Ударыць па прымірэнчых адносінах да барацьбы з шавінізмамі

Антысэміцкія вылазкі ў Белсельтрэсьце

АНТЫСЭМІТЫЗМ ПРЫКРЫВАЕЦЦА „СЯБРОЎСКІМІ ЖАРТАМІ“

Што ўхваліла бюро Фрунзаўскага РК КП(б)Б

Пядаўна наш друк паведамляў аб агіднейшых антысэміцкіх праявах з боку групы спэцыялістых Белсельтрэсту. **Грыгаровіч** — аграном-жывёлавод **Зэпольскі** — аграном - палявод, **Страйкоў і Бяшноў** — эканамісты, — доўгі час цкавалі і здзекваліся з гандлёвага агента **Айзбэля**. У апошні раз яны выклікалі Айзбэля ў габінэт дырэктара, пэцкалі яму нос, і ўчынілі іншыя хуліганскія антысэміцкія выхадкі.

Вадву Айзбэля аб гэтым факце разгладаў мясцком, які кваліфікаваў справу, як толькі «недапушчальнае зьявішча, якое мяжуецца з антысэмітызмам».

Антысэмітызму своячасова ня быў [illegible] належны рашучы адпор. Партчастка Белсельтрэсту, якая ў асноўным [illegible] кваліфікавала антысэміцкія [illegible] са спазьненьнем дала палітычную ацэнку гэтай справе.

[illegible]ўвае ўвагі агульны сход супрацоўнікаў Белсельтрэсту, які нядаўна [illegible]ся на пытаньні аб цкаваньні [illegible]бяля. Самы ход і характар абмеркаваньня гэтай справы па агульным [illegible]жа аб пэўнай і сьвядомай [illegible]ы групы работнікаў Белсельтрэсту замаскаць палітычную вострасьць справы, як характэрнай антысэміцкай вылазкі і зьвесьці яе да звычайных „сяброўскіх жартаў“.

[illegible] пераважнай большасьцю [illegible] на сходзе па прапанове спэц[illegible]га Дворкіна, — рэзалюцыя, выяўляецца выразным адбіткам апалітычнасьці часткі служачых Белсельтрэсту, гаворыць аб тэндэнцыі з боку супрацоўнікаў актыўна выступіць супроць мерапрыемстваў партчасткі Белсельтрэсту.

Замест выразнага абмежаваньня ад [illegible] антысэмітаў, замест іх рашучага асуджэньня і выкрыцьця сацыяльна-карэньняў усёй гэтай справы, рэзалюцыя займаецца ліберальна-талстоўскімі заклікамі да работнікаў: «...пакласьці канец усякім жартам, якія могуць толькі пакрыўдзіць чалавека і ўнесьці раздар паміж работнікамі аднаго калектыву».

Рэзалюцыя гэтага сходу наогул адмаўляе правільнасьць палітычнай ацэнкі справы, данай нашым друкам і партчасткай Белсельтрэсту.—«Агульны сход ня можа не адзначыць буйнейшай памылкі, дапушчанай у ацэнцы гэтай справы» (рэзалюцыя сходу).

Аб чым гэта гаворыць?

Гэта гаворыць аб **«пэўнай палітычнай спробе групы работнікаў Белсельтрэсту дыскрэдытаваць лінію партыі ў нацыянальным пытаньні,** пакіраваную на выкрыцьцё клясавай сутнасьці тэй нацыянальнай варожасьці, якая распаўсюджваецца буржуазіяй і яе падпявалмі» — так кваліфікавала бюро Фрунзаўскага РК КП(б)Б прынятую рэзалюцыю агульнага сходу работнікаў Белсельтрэсту.

Бюро раённага камітэту партыі, кваліфікуючы справу цкаваньня таварыша Айзбэля, як характэрную ярка выяўленую антысэміцкую вылазку, адзначыла, што і весь ход абгаварэньня гэтай справы сярод работнікаў Белсельтрэсту сьведчыць аб наяўнасьці раду нездаровых зьявішч у апараце Белсельтрэсту. У сваёй пастанове бюро Фрунзаўскага РК ухваліла рад канкрэтных мерапрыемстваў па аздараўленьні работы апарату Белсельтрэсту.

Бюро ўхваліла паставіць пытаньне **аб роспуску мясцкому,** правяўшага клясавую сьлепату ў справе Айзбэля. **Членам фракцыі мясцкому Зайцаву, Ланейскаму, Беднаму, Папову абвешчана суровая вымова.** За недаацэнку неабходнасьці мабілізацыі ўвагі партыйнай і беспартыйнай масы работнікаў Белсельтрэсту навакол антысэміцкай вылазкі — **абвешчана вымова ўсяму складу бюро парт'ячэйкі.**

Райком абавязаў партыйную ячэйку разгарнуць шырокую масавую работу па праваздзеньні месячніка беларусізацыі, зьвярнуць асаблівую ўвагу на барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, узмацніць разам з гэтым барацьбу з беларускім нацыянал-дэмакратызмам і іншымі шавінізмамі.

Бюро РК паставіла пытаньне перад ЦК КП(б)Б аб тэрміновай неабходнасьці ўзмацніць партыйную частку работнікаў Белсельтрэсту, забясьпечыць больш шпаркія тэмпы арабочаньня апарату.

С.

Узмацніць інтэрнацыянальнае выхаваньне ў калгасах!

Шавіністыя зрываюць уборачную кампанію

Карэньні антысэмітызму прасякаюць у гушчу калгасных мас з мэтай дэзарганізаваць творчую работу калгасаў, папкодзіць пасьпяховаму правядзеньню ўборачнай кампаніі і асеньняй пасеўкампаніі. Нядаўна ў калгасе «Чырвоны Барацьбіт», у мястэчку Бялынічы, у часе работы калгасу па ўборцы ільну, члены калгасу **Цыбульская Ганна** (бацька якой у гады чорнай рэакцыі прымаў удзел у разгромах рабочых кварталаў у Ленінградзе і інш. гарадох), **Чорная Марфа, Куліковы Мар'я і Вера** пачалі цкаваць калгасніцу **Купэрман Геню,** якая разам з імі працавала.

— Жыдоўка, з табой мы працаваць ня можам, жыдоў трэба выселіць! Калі-б ня жыды, ня было-б калгасаў.

Адначасова з гэтымі выкрыкамі штурхалі **Купэрман Геню,** не давалі ёй працаваць і таму яна вымушана была пайсьці з поля.

Калі калгасьніцы, працаваўшы там жа на полі, сталі абаранаць Купэрман ад антысэмітак, апошнія пачалі крычаць на іх «вы за жыдоў, дык працуйце з імі».

Мясцовая партыйная ячэйка і Бялынічы Райком КП(б)Б тэрмінова прынялі адпаведныя меры да высьвятленьня і выкрыцьця праяў антысэмітызму ў калгасе «Чырвоны Барацьбіт». Гэтае пытаньне абмеркавана на пасяджэньні бюро ячэйкі КП(б)Б, бюро райкому КП(б)Б і бюро Райкому камсамолу, вынесены адпаведныя пастановы, справа перадана сьледчым органам для прыцягненьня асоб, якія праяўлялі антысэмітызм, да судовай адказнасьці. Сход калгаснікаў, скліканы на гэтым пытаньні, даў рашучы адпор антысэміцкім праявам. У сваёй пастанове сход адзначыў: **«Агульны сход рашуча асуджае і ганьбіць антысэміцкія ўчынкі часткі калгаснікаў** (Цыбульская, Чорная і інш). **І заклікае кожнага калгасьніка ў далейшым весьці рашучую барацьбу з антысэмітамі, якія прабуюць разлагаць нашы працоўныя рады, нацкоўваючы адну нацыю на другую, весьці барацьбу з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам, беларускім нацыянал-дэмакратызмам, яўрэйскім, польскім і інш. шавінізмамі».**

Партыйная і камсамольская арганізацыям Бялынічаў трэба ўзмацніць выхаваўчую работу сярод калгасьнікаў і работу па інтэрнацыянальным выхаваньні.

Агонь на антысэмітах, п'яніцах, разгільдзяях, дружнай работай па скансалідаваньні ўборачнай кампаніі і правядзеньні асеньняй пасеўкампаніі своячасова і з посьпехам дамо рашучы адпор нашым клясавым ворагам.

А. І. Харкевіч.

Месячнік беларусізацыі

У Белмузтэхнікуме

У сувязі з месячнікам праверкі беларусізацыі, агульны сход студэнтаў і настаўнікаў Белмузтэхнікуму выбраў брыгаду для правядзеньня месячніка. Брыгада праверыла ўсю культмасавую работу прафкому і мясцкому ў галіне беларусізацыі, абсьледавала дзейнасьць у гэтым напрамку бібліятэкі тэхнікуму. З 20 па 23 верасьня праводзілася праверка ведаў беларускае мовы настаўнікамі, ужываньне беларускай мовы ў выкладаньні, у штодзённым жыцьці. Выпускаецца спэцыяльны нумар насьценнае газэты, прысьвечаны пытаньню нацыянальнага. Праводзяцца нарады і гутаркі па гэтым пытаньні ў інтэрнатах тэхнікуму. Арганізаваліся гурткі па вывучэньні беларускае мовы, гісторыі, беларускае літаратуры, эканомікі, гісторыі рэвалюцыйнага бальшавіцкага руху на Беларусі.

Д.

Беларусізацыя навыварат

Нашы савецкія ўстановы ў Мазыры і дагэтуль фармальна праводзяць беларусізацыю. І дагэтуль ня толькі гаворыць, але часта і пішуць парасійску, або напісанае парасійску — машыністкамі перакладаецца на беларускую мову ў сакаўным выглядзе. Бываюць выпадкі ня толькі граматычных памылак, але грубых палітычных, якія скажаюць зусім сэнс тых паперак, якія выходзяць з устаноў.

Вось канвэрт Лесбелу з такім адрасам: **«Жывёла - будаўнічаму каапэратыйнаму таварыству».** Ужыта слова «жывёла», замест «жыльлёва».

Перад 16-м МЮД'ам у Мазыры на Пляцы Волі павешана (і зараз вісіць) фанэрная дошка, на якой на чырвоным фоне белымі літарамі напісана: «За забарону СССР — бацькаўшчыны міжнароднага пралетарыяту». Пры перакладзе на расійскую мову — гэта будзе контррэвалюцыйны лёзунг, які заклікае не да абароны, а за забарону (запрещение) СССР.

Такія факты бязумоўна выкарыстоўваюцца варожа - настроенымі супроць нацыянальнай палітыкі элемэнтамі, выкарыстоўваюцца нашым клясавым ворагам.

Ів. Д—скі.

На раённых партканфэрэнцыях

За якаснае палепшаньне партработы на вёсцы

Бязьлітасна выкараняць праваапартуністычную практыку, выразна ажыцьцяўляць дырэктывы партыі

Канфэрэнцыя абнавіла парткіраўніцтва Талачынскай арганізацыі

Камісіяй ЦК УсеКП(б) па праверцы работы арганізацыі КП(б)Б і райпартканфэрэнцыяй выяўлены рад буйных прарываў у рабоце **Талачынскай раённай партарганізацыі** і праяў правага апартунізму на практыцы.

Раённы камітэт КП(б)Б амаль не кіраваў калгасным рухам. У выніку чаго на чале асобных калгасаў былі варожыя элемэнты. Напрыклад, кіраўніком яўрэйскага нацыянальнага калгасу «Чырвонае Поле» зьяўляўся нэпман смадакур Каждан. Для таго, каб пакінуць у сваім карыстаньні смалакурнае прадпрыемства, Каждан здае яго ў калгас, але бярэ за гэта 1.500 руб. гатоўкай і 1.500 вэксэлямі. Гэту нэпманскую зьдзелку санкцыянаваў РВК, а вучастковы пракурор Шпэйзер, які прысутнічаў пры гэтай агіднейшай зьдзелцы, заахвочваў калгаснікаў, гаворачы: «маслам кашу не сапсуеш».

За два гады існаваньня калгасу «Чырвонае Поле» нэпман Каждан набіваў свае кішэні, эксплёатуючы калгаснікаў з беднаты. 4.000 руб. крэдыту, якія атрымаў калгас ад дзяржавы, амаль поўнасьцю пераўшлі ў кішэню нэпмана. Такім чынам, калгас даведзен да поўнага заняпаду.

Раённая партарганізацыя **ня здолела** стаць на чале калгаснага руху, у выніку чаго прыцёк беднякоў і серадняко́ў адзіноасобнікаў у калгасы спыніўся. Сельска-гаспадарчыя кампаніі, якія зараз праводзяцца ячэйкам, не падпарадкоўваюцца галоўнейшай задачы — калектывізацыі. Наадварот, паасобныя калгасы (калгас «Гэрой», імя Сталіна) адмаўляюць у прыёме тым, якія хочуць уступіць у калгасы. Большасьць ячэек не вядзе работы з беднатою і батрацтвам. Масавая работа навакол задач выкананьня бягучых гаспадарча-палітычных кампаній не разгорнута. У практыцы правядзеньня збожжазагатовак ёсьць выпадкі скрыўленьня лініі партыі. Член Слаўнаўскай ячэйкі **Чарнушчык** на сходзе сялян вёскі Маляўка абраў камісію для абходу двароў з мэтай выяўленьня хлебных лішкаў у бяднацка-серадняцкіх гаспадарак. Яўлахоўская ячэйка збожжазагатоўкі праводзіла шляхам вызначэньня цьвёрдых заданьняў бяднацка-серадняцкім гаспадаркам, а не ў парадку самаабвязацельства. Повадам для такіх мэтадаў правядзеньня збожжазагатовак паслужылі дырэктыва бюро РК КП(б)Б ад 19-га жніўня «аб давядзеньні збожжазагатовак да паасобнага сялянскага двара».

У Талочынскім раёне ёсьць прадпрыемствы: гарбарня, крухмальня і лесазавод. Рабоце гэтых прадпрыемстваў райком не аддаваў ніякай увагі. Пытаньняў аб выкананьні прамфінпляну на гэтых прадпрыемствах, разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва бюро РК ні разу не абмяркоўвала. Старшыня заўкому гарбарні, робячы справаздачу аб рабоце, моўчкі абышоў пытаньні сацспаборніцтва, ударніцтва і сустрэчнага прамфінпляну. Азэрыцкая ячэйка не вядзе барацьбы з адсталымі рвацкімі настроямі сярод рабочых, якія маюць месца на лесазаводзе.

Праваапартуністычная практыка ў рабоце Талочынскай партарганізацыі. «левыя» загібы, паслабленьне партдысцыпліны, моманты бытавога загніваньня мелі месца на працягу доўгага часу толькі таму, што самакрытыка ў арганізацыі ня была разгорнута, што таварышы, якія сталі на чале арганізацыі, — **Куніцкі, Шаўцоў** ня былі здольны праводзіць правільную партыйную лінію, не змаглі мабілізаваць партыйную арганізацыю на барацьбу супроць правага ўхілу, а самі зьяўляліся яўнымі апартуністымі.

Гэта праваапартуністычная практыка ў рабоце арганізацыі і інш. нездаровыя зьявішчы **жорстка асуджаны** раённай партыйнай **канфэрэнцыяй. Канфэрэнцыяй абноўлена кіраўніцтва райпартарганізацыі.** Зараз галоўнейшай задачай у рабоце Талочынскай арганізацыі зьяўляецца ліквідацыя тых буйных прарываў, якія мелі месца, бязьлітасная барацьба з правямі правага апартунізму на практыцы, мабілізацыя ўвагі ўсёй партарганізацыі вакол задач пяцігодкі, ажыцьцяўленьня лініі партыі.

П. Цішураў.

Карма

10 верасьня адбылася Кармянская раённая партканфэрэнцыя. Канфэрэнцыя адзначыла рад буйных прарываў у рабоце раённай арганізацыі на правядзеньні с.-г. кампаніі.

Плян збожжазагатовак за жнівень і верасень месяцы выкананы толькі на 63,5 проц. У гэтай справе вельмі адстае адзіноасобны сэктар. Гадавы плян загатовак выкананы ў раёне ўсяго на 8%.

Замест арганізацыі калгаснікаў і бяднацка-серадняцкіх мас на выкананьне важнейшых заданьняў партыі, замест рашучай барацьбы з кулацкімі элемэнтамі, якія вядуць варожую агітацыю за зрыў кампаніі, у паасобных ячэйках ёсьць праваапартуністычныя разважаньні:

— «Кулацтва ўжо ў аспоўным ліквідавана і ніякай небясьпекі яно сабою ня ўяўляе». У выніку—рад кулацкіх гаспадарак заданьняў па збожжазагатоўках ня выконвае.

У калгасах раёну марудна праходзяць абмалот і ачыстка насеньня. Асобныя сакратары ячэек даюць няправільныя ўстаноўкі ў збожжазагатоўках. Былі выпадкі, калі адзіноасобным бяднацкім і серадняцкім гаспадаркам выначаліся заданьні не ў парадку самаабвязацельства.

Калгасы слабым тэмпам выконваюць заданьні па збожжазагатоўках, а асобныя ячэйкі лічаць такое становішча нармальным. «Збожжа з калгасаў нікуды не ўдзіча», — апраўдваюць сваю бязьдзейнасьць асобныя камуністыя і ячэйкі.

Партыйныя ячэйкі слаба кіруюць камсамолам. Камсамольцы-калгаснікі мала садзейнічаюць узмацненьню працдысцыпліны ў калгасах.

У раёне слаба разгорнута работа па мабілізацыі сродкаў насельніцтва. Пазыка «Пяцігодка—за чатыры гады» распаўсюджана толькі на 63 проц.

З мэтай узмацненьня работы ў раёне па калектывізацыі кафэрэнцыя побач з іншымі канкрэтнымі мерапрыемствамі запрапанавала ячэйкам арганізаваць на ўсіх вёсках батрацка-бяднацкія ініцыятыўныя групы, а таксама правесьці з 15 верасьня двухтыднёвік справаздачы калгасаў перад індывідуальным сэктарам.

Канфэрэнцыя абрала склад РК у ліку 15 чал. і РКК—7 чал.

Асіпавічы

На канфэрэнцыі Асіпавіцкай райпартарганізацыі па дакладах аб асеньняй сяўбе і збожжазагатоўках выказалася ў спрэчках 15 таварышоў. Прамоўцы гаварылі аб задачах раённай партарганізацыі ў справе правядзеньня калектывізацыі, жорстка крытыкуючы моманты праваапартуністычнай стаўкі на самацёк, якая заўважаецца ў рабоце асобных камуністых і некаторых ячэек.

Канфэрэнцыя завастрыла ўвагу партарганізацыі на задачах неадкладнага выпраўленьня памылак і скрыўленьняў партыйнай лініі, якія былі дапушчаны ў рабоце па збожжазагатоўках.

Клічаў

Па дакладу аб чарговых задачах раённай партарганізацыі, **які абмяркоўваўся на Клічаўскай раённай партканфэрэнцыі,** выказалася ў спрэчках 24 таварышы.

Прамоўцы адзначылі, што з боку райкому КП(б)Б за апошні час паслаблена кіраўніцтва работаю ячэек. Многія ячэйкі ў рабоце па правядзеньні с.-г. кампаніі зусім недаацэньваюць значэньня работы сярод бедноты і батрацтва.

Канфэрэнцыя адзначыла, што асобныя парт'ячэйкі, савецкія і калгасна-каапэрацыйныя арганізацыі не рэагуюць на такія моманты, калі некаторыя калгасы («Авангард» і інш.) не аддаюць таварных лішкаў дзяржаве, а збываюць на прыватны рынак. На задачах барацьбы з такім адмоўным зьявішчам, канфэрэнцыя завастрыла ўвагу ўсёй раённай партарганізацыі.

Ч—н.

Заслаўе

21-га верасьня адбылася пазачарговая Заслаўская раённая партканфэрэнцыя. Канфэрэнцыя абмеркавала чарговыя задачы, якія стаяць перад раённай партарганізацыяй у справе ажыцьцяўленьня дырэктыў XVI з'езду УсеКП(б) XIII з'езду КП(б)Б.

Выступаўшыя ў спрэчках таварышы гаварылі аб задачах ліквідацыі [illegible]ваў у галіне раённага будаў[illegible] вёлагадоўлі, сіласаваньня і [illegible]

Большасьцю тэмпы ў рабо[illegible]саў, іх значныя гаспадарчыя [illegible]ньні разьбіваюць усе варожыя думкі і праваапартуністычныя настроі ў пытаньні калектывізацыі. За час асеньняй пасеўнай кампаніі арганізаваны **тры новых калгаса.**

Канфэрэнцыя завастрыла ўвагу партыйнай арганізацыі на задачах палепшэньня кіраўніцтва **рабселькорўскім рухам** у раёне, які павінен быць накіраваны на выкананьне баявых задач партыі.

Канфэрэнцыя паслала прывітальную тэлеграму ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Паводле прапановы т. Харытонава аб зборы сродкаў на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў» дэлегаты сабралі 72 руб. 50 кап.

Канфэрэнцыя абрала РК КП(б)Б у ліку 19 членаў і 6 кандыдатаў. Сакратаром РК абраны т. **Майсееў,** старшынёю РКК т. **Мілер.**

Шапькевіч.

Райпартканфэрэнцыі вітаюць ЦК КП(б)Б

На імя Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б атрыманы прывітальныя тэлеграмы ад **быхаўскай, поеўскай, хапоненіцкай** райпартканфэрэнцый.

Канфэрэнцыі запэўняюць ЦК КП(б)Б, што задачы, пастаўленыя партыяй перад раённымі арганізацыямі, будуць выкананы.

Рабочыя Савецкага Саюзу вынесьлі свой прыгавар

Стаўка агентаў міжнароднага капіталу на арганізацыю голаду--біта

ЛЕПШЫХ РАБОЧЫХ—У ОРГАНЫ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ

Вернаму вартавому пралетарскай дыктатуры—АДПУ—ордэн Леніна

Калегія АДПУ, разгледзеўшы па даручэньні ЦВК Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх дэпутатаў і СНК СССР справу аб контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай арганізацыі ў галіне забесьпячэньня насельніцтва прадуктамі харчаваньня, матар'ялы па якой былі апублікаваны ў „Правде“ ад 22 верасьня 1930 г., пастанавіла:

1. РАЗАНЦАВА, Алеся Васілева, нарадж. 1874 г., прафэсара, былога дваранина, [illegible]шарніка, былога генэрал-[illegible]ора, які займаў пасады: члена Праўленьня Цэнтрахладбойні, намесьніка старшыні Праўленьня Маслахладбойні, 1928 г. — старшыні тэхнічнага савету хладазільнага камітэту пры Наркамгандлю СССР (заснавальнік контр-рэвалюцыйнай арганізацыі);

2. КАРАТЫГІНА, Яўгена Сяргеева, нарадж. 1872 г., прафэсара, які да рэвалюцыі працаваў галоўным рэдактарам «Торгово-промышленной газеты» і «Вестника финансов»—органы міністэрства фінансаў, які займаў пры савецкай уладзе рад адказных пасад, старшыні сельска-гаспадарчай сэкцыі прамляну ВСНГ СССР, старшыні НПСА Мясельпрому ВСНГ СССР і намесьніка старшыні КПС харчовай і сельска-гаспадарчай прамысловасьці пры Наркамгандлю СССР (кіраўнік контррэвалюцыйнай арганізацыі);

3. КАРПЕНКА, Міхася Захарава, нарадж. 1874 г., які займаў пасаду галоўнага інжынэра Хладацэнтру, былога дваранина, былога палкоўніка (арганізатар шкодніцтва);

4. ВАРАШОВА, Міколу Міколава, нарадж. 1882 г., які займаў пасаду кансультанта Наркамгандлю РСФР па хладазільнай справе, былога дваранина, былога абшарніка (кіраўнік шкодніцтва ў хладазільнай справе);

5. ПЯТРОВА, Міколу Платонава, нарадж. 1871 г., які займаў пасаду загс кансэрвным аддзелам Саюзмяса, былога палкоўніка;

6. КУРАНАВА, Міколу Андрэева, нарадж. 1879 г., які займаў пасаду намесьніка загадчыка кансэрвным аддзелам Саюзмяса, былога дваранина, былога палкоўніка;

7. ДЗЯНІСАВА, Паўла Ігнатава, нарадж. 1882 г., які займаў пасаду [illegible]а начальніка Праўленьня Саюзмяса, галоўнага інжынэра (арганізатар шкодніцтва);

8. [illegible]АШЭНЬНІКАВА, Міхася Іванава, нарадж. 1889 г., які займаў пасаду [illegible]аведа Саюзмяса, былога афіцэра;

9. [illegible]СТРЫНА, Самуіла Грыгорава, [illegible] 1887 г., які займаў пасаду [illegible]іка начальніка Праўленьня Саюзмяса (адзін з заснавальнікаў шкодніцкай арганізацыі);

10. БАРДЫКА, Алеся Ісакава, нарадж. 1895 г., які займаў пасаду начальніка Управленьня загатовак і разьмеркаваньня Саюзмяса;

11. ЛЕВАНДОЎСКАГА, Барыса Абрамава, нарадж. 1890 г., які займаў пасаду загадчыка аддзелу збыту і разьмеркаваньня Саюзмяса (арганізатар шкодніцтва ў мясной справе);

12. ВОЙЛАШНІКАВА, Адзіва Адрыянова, нарадж. 1877 г., былога меншавіка, які займаў пасаду адказнага выканаўцы Саюзмяса (арганізатар шкодніцтва ў «Госмясе»);

13. КУПЧЫНА, Міхася Міколава, нарадж. 1887 г., які займаў пасаду адказнага выканаўцы Саюзмяса;

14. ГІНЗБУРГА, Аскара Маісеева, нарадж. 1891 г., які займаў пасаду загалічка бакавым аддзелам Саюзмяса;

15. ДРАЗДОВА, Васіля Паўлава, нарадж. 1872 г., які займаў пасаду кансультанта [illegible] Саюзмяса (арганізатар шкодніцтва ў мясной справе);

16. ВЫ[illegible]СКАГА, Канстанціна Казіміравa, нарадж. 1894 г., які займаў пасаду намесьніка ўпаўнаважанага Сібірскай канторы Саюзмяса, былога гвардзейскага афіцэра (кіраўнік шкодніцтвам ў канторы Саюзмяса);

17. САКАЛОВА, Юрку Грыгорава, нарадж. 1887 г., які займаў пасаду загадчыка адкормаў жывёлы: Сібірскай канторы Саюзмяса, былога капітана царскай армії і начальніка забесьпячэньня армії Калчака;

18. САКАЛОВА, Сяргея Паўлава, нарадж. 1889 г., які займаў пасаду інспэктара Уральскай канторы Саюзмяса;

19. ВЭНДТА, Карла Мартынава, нарадж. 1881 г., займаўшага пасаду тэхнарука кансэрвнай фабрыкі Троіцкага камбінату Саюзмяса, былога ўласьніка кансэрвнай фабрыкі;

20. КУРЫГІНА, Міхася Пятровіча, нарадж. 1875 г., займаўшага пасаду тэхнарука па убою быдла Троіцкага камбінату Саюзмяса;

21. КУРАЧКІНА, Канстанціна Алесева, нарадж. 1899 г., займаўшага пасаду загадчыка лябараторыяй Троіцкага камбінату Саюзмяса, былога дваранина, б. белага афіцэра.

22. ЦІХАЎСКАГА, Канстанціна Пятрова, нарадж. 1876 г., займаўшага пасаду інжынэра будаўнічага кіраўніцтва Саюзрыбы, былога падпалкоўніка;

23. ЯЗЕРСКАГА, Анатолія Іванава, нарадж. 1890 г., займаўшага пасаду члена Праўленьня Саюзрыбы, былога ўпраўляючага рыбнымі промысламі Сапожнікавых (арганізаваў і кіраваў шкодніцтвам па рыбе ў Саюзрыбе);

24. ФІШЗОНА, Ізраіля Майсеевіча, нарадж. 1892 г., займаўшага пасаду загадчыка плянава-справаздачнай групай Саюзрыбы, былога рыбапрамыслоўцы (кіраўнік контр-рэвалюцыйнай арганізацыі ў Саюзрыбе);

25. ФІШЗОНА, Пятра Майсеевіча, нарадж. 1886 г., займаўшага пасаду загадчыка эканамічна-арганізацыйнай групы Інстытуту рыбнай гаспадаркі, былога рыбапрамыслоўцы;

26. АРЦЫБАШАВА, Міхася Пятрова, нарадж. 1884 г., займаўшага пасаду дырэктара Волга-Касьпійскага раёну Саюзрыбы, былога дваранина, былога марскога афіцэра, удзельніка пакараньня сьмерцю рэвалюцыйных матросаў у 1905 годзе;

27. БЕРГАМЫШАВА, Мікалая Алесева, нарадж. 1885 г., займаўшага пасаду дырэктара вытворча-тэхнічнага кіраўніцтва Саюзрыбы, былога дваранина;

28. БАЛАНАВА, Васілія Васілева, нарадж. 1882 г., займаўшага пасаду даверанага экспарт-кіраўніцтва Саюзрыбы, былога рыба-прамыслоўцы (арганізатар шкодніцтва ў галіне экспарта рыбы);

29. ШПІРКАНА, Віталія Іракліевіча, нарадж. 1887 г., займаўшага пасаду даверанага экспорт-кіраўніцтва Саюзрыбы;

30. КАЗАКОВА, Міхася Алесева, нарадж. 1880 г., які займаў пасаду кансультанта Саюзрыбы, былога дваранина;

31. НІКІЦІНА, Сяргея Паўлава, нарадж. 1893 г., які займаў пасаду намесьніка старшыні праўленьня Волга-Касьпійскага рыбнага трэсту, былога афіцэра-калчаноўца (кіраўнік контррэвалюцыйнай арганізацыі ў Волга-Касьпійскім рыбным трэсьце);

32. КАСЬПІЙЦАВА, Захара Янкава, нарадж. 1880 г., які займаў пасаду адказнага спэцыяліста рыбніка Армекгандлю, былога гандляра рыбай;

33. ГАЛОЎКІНА, Алеся Іванава, нарадж. 1888 г., які займаў пасаду адказнага спэцыяліста-рыбніка Армекгандлю, былога гандляра рыбай;

34. ЦЯРЭШЧАНКА, Кузьму Кірылава, нарадж. 1883 г., які займаў пасаду члена праўленьня Азрыбтрэсту, былога члена Ўстаноўчага збору ад правых эсэраў (кіраўнік контр-рэвалюцыйнай арганізацыі ў Азрыбтрэсьце);

35. ШЧАРБАКОВА, Сямёна Васілева, нарадж. 1883 г., які займаў пасаду члена праўленьня Ўсерыбтрэсту (кіраўнік контр-рэвалюцыйнай арганізацыі Ўседзяржрыбтрэсту);

36. РУБІНШТЭЙНА, Якуба Львовіча, нарадж. 1891 г., які займаў пасаду члена праўленьня Ўседзяржрыбтрэсту (праводзіў шкодніцтва ў забесьпячэньні рыбай пралетарскіх цэнтраў);

37. ВОЛЬ-ЭПШТЭЙНА, Леаніда Захарава, нарадж. 1889 г., які займаў пасаду памочніка нач. управленьня рэалізацыі Саюзрыбы;

38. ТАЛСТОГА, Уладзімера Канстанцінава, нарадж. 1882 г., які займаў пасаду дырэктара паўночнага і Азоўскага раёнаў Саюзрыбы, былога дваранина (кіраўнік шкодніцтвам па Паўночным і Азоўскім рыбных раёнах);

39. КАРПАВА, Пятра Янкава, нарадж. 1875 г., які займаў пасаду тэхнічнага дырэктара трэсту, былога буйнога фабрыканта (арганізатар шкодніцтва ў вырабу снасьцей);

40. АБДУЛАЕВА, Гамдупа, нарадж. 1881 г., які займаў у 1928-29 годзе пасаду дырэктара рыбтрэсту, ў апошні час зволенага з гэтай пасады (праводзіў шкодніцтва па Дагестанскім рыбным раёне);

41. РОЗЭНБЭРГА, Леаніда Самойлавіча, нарадж. 1887 г., займаўшага пасаду тэхнарука праектнай канторы Саюзкансэрва (кіраваў шкодніцтвам па Саюзкансэрву);

42. БРАЙЛОЎСКАГА, Алеся Майсеевіча, нарадж. 1883 г., займаўшага пасаду намесьніка загадчыка вытворчага кіраўніцтва Саюзплодагародніна (кіраўнік шкодніцтвам ў Саюзплодагародніне);

43. РАМАНОЎСКАГА, Аляксея Міхайлавіча, нарадж. 1897 г., займаўшага пасаду намесьніка нач. праектна-будаўнічага кіраўніцтва Саюзплодагародніна, былога афіцэра;

44. ДАНЦЫГЕРА, Льва Самойлавіча, нарадж. 1887 г., былога даверанага румынскай фірмы «Бравэрман»;

45. КАЗЛОВА, Івана Арсеньевіча, нарадж. 1886 г., займаўшага пасаду адказнага выканаўцы бконтрэсту;

46. РАГАЛЕВА, Алеся Васілевіча, нарадж. 1879 г., займаўшага пасаду майстра Троіцкага кансэрвнага заводу Саюзмяса з 1912 па 1920 г. служыў на кансэрвным заводзе ангельцаў;

47. ШАПАШНІКАВА, Стэфана Зьмітравіча, нарадж. 1887 г., займаўшага пасаду Інжынэра Інстытуту рыбнай гаспадаркі, былога ўласьніка хладазільнага прадпрыемства;

48. ФАЛЕЕВА, Ціхана Мікалаева, нарадж. 1889 г., займаўшага пасаду супрацоўніка Дзяржпляну,—як актыўных удзельнікаў шкодніцкай арганізацыі і незамірных ворагаў Савецкай улады—РАССТРАЛЯЦЬ.

Прыгавар выканан.

Старшыня АДПУ МЕНЖЫНСКІ.

Пралетарыят БССР вітае рэвалюцыйны прыгавар над шкоднікамі

Пастанова Калегіі АДПУ аб расстрэле арганізатараў контр - рэвалюцыйнай і шкодніцкай арганізацыі і выкананьне прыгавару спаткана пралетарыятам БССР з глыбокім задавальненьнем. У рэдакцыю «Зьвязды» бязупынна паступаюць рэзалюцыі ад розных фабрык, заводаў і ўстаноў, у якіх **рабочыя і служачыя вітаюць і поўнасьцю ўхваляюць** мерапрыемствы Калегіі АДПУ ў адносінах да шкодніцкай рабочага забесьпячэньня, арганізатараў голаду ў краі, і запэўняюць партыю і савецкую ўладу ў тым, што напружаць усе свае сілы для выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, для пабудовы сацыялізму ў нашым краі.

Вітаем прыгавар над шкоднікамі

Так, супрацоўнікі Белкаапсаюзу ў рэзалюцыі адзначаюць: з першых-жа дзён дыктатуры пралетарыяту нямала было спроб з боку сусьветнай контррэвалюцыі задушыць кастлявай рукой голаду першую ў сьвеце рэспубліку дыктатуры пралетарыяту.

На працягу апошніх гадоў ня раз шкодніцкія арганізацыі прабавалі разбурыць важнейшыя вучасткі нашай гаспадаркі: вугаль, транспарт, чорную мэталургію і г. д. Зараз шкоднікі, засеўшы ў загатоўчых і забесьпячальных арганізацыях, на працягу некалькіх год рабілі сваю агідную справу па арганізацыі голаду мільённых мас пралетарыяту, каб такім шляхам выклікаць нездавальненьне шырокіх рабочых мас супроць пралетарскай дзяржавы і скінуць савецкую ўладу.

Агульны сход з абурэньнем канстатуе гэту агідную шкодніцкую работу ў справе рабочага забесьпячэньня. **Агульны сход вітае і поўнасьцю ўхваляе пастанову Калегіі АДПУ аб расстрэле контр - рэвалюцыянэраў — гэтых агентаў сусьветнага імпэрыялізму.**

Сход адзначае, што неабходна яшчэ больш павялічыць пільнасьць рабочае клясы і ўсіх працоўных да работы ў загатоўчых і забесьпячальных органах, павялічыць масавы кантроль над работай каапэрацыйных, загатоўчых органаў з боку рабочых мас.

Агульны сход калектыву супрацоўнікаў БКС абяцае ўдарнымі тэмпамі працаваць па забесьпячэньні рабочых, узьняць актыўнасьць і пільнасьць кожнага супрацоўніка, дабіцца пастаноўкі гэтае работы на належную вышыню. Супрацоўнікі патрабуюць яшчэ большага і рашучага арабочаньня апарату і падрыхтоўкі новых кадраў.

Прэч з савецкага апарату шкоднікаў і контр - рэвалюцыянэраў!

Няхай жыве камуністычная партыя—кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР!

***

Агульны сход супрацоўнікаў апарату МЦРК ПОЎНАСЬЦЮ ЎХВАЛЯЕ ПАСТАНОВУ КАЛЕГІІ АДПУ аб расстрэле контр - рэвалюцыянэраў і шкодніцкаў рабочага забесьпячэньня.

Сход заяўляе, што супрацоўнікі МЦРК з падвойнай сілай і энэргіяй возьмуцца за выкананьне задач па арганізацыі рабочага забесьпячэньня, больш гібкай і выразнай работай будуць ліквідаваць усе прарывы, якія былі ў МЦРК.

Сход просіць ЦКК-РСІ ў тэрміновым парадку пераглядзець склад апарату загатоўчых арганізацый, з мэтай выдаленьня там шкодніцтва.

Факты штодня прыбываючай гнілой агароднины аж да выпадкаў 100-процантнай гнілі, гаворыць аб тым, што ня ўсё добра ў беларускіх арганізацыях.

З абурэньнем ганьбяць арганізатараў голаду

Заслухаўшы інфармацыю аб выкрытай АДПУ контр - рэвалюцыйнай арганізац

АПОШНЮЮ ПЯЦІДНЕЎКУ—

НА ПАКРЫЦЬЦЕ ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦІ ДРУГОГА ГОДУ

Дзелавой падрыхтоўкай да Дня ўдарніка праверым гатоўнасьць да баявога трохмесячніка

Шырэй дарогу пачыну гомельскіх друкароў--вытворчым манэўрам

Вытворчыя манэўры

--лепшая форма падрыхтоўкі да ўдарнага кварталу

На адозву ЦК УсеКП(б) рабочыя масы адказалі магутнай хваляй вытворчага энтузіязму, які выліўся ў новыя, яшчэ да гэтага часу ня ўжываныя формы ўдарніцтва.

Сярод гэтых форм значэньне першаступовай важнасьці набывае пачынаньне гомельскіх друкароў, арганізаваўшых у сябе на прадпрыемстве **ВЫТВОРЧЫЯ МАНЭЎРЫ.** Аб іх сутнасьці «Зьвязда» ў свой час давала падрабязны матар'ял.

Манэўры павінны знайсьці самае шырокае ўжываньне на прадпрыемствах. Гэта новая форма барацьбы за прамфінплян павінна быць выкарыстана з усёй поўнатой менавіта зараз, у апошнія дні другога году пяцігодкі, перад пачаткам ударнага кварталу. **МАНЭЎРЫ ЗЬЯВЯЦЦА ЛЕПШЫМ СРОДКАМ ПРАВЕРКІ ГАТОЎНАСЬЦІ КОЖНАГА ПРАДПРЫЕМСТВА, ЦЭХУ І АСОБНАГА РАБОЧАГА ДА ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНАЎ УДАРНАГА КВАРТАЛУ.**

З гэтага пункту гледжаньня ролю манэўраў трудна пераацаніць. Яны маюць вялізарнае значэньне для павышэньня кантрольных паказальнікаў усіх галін савецкай прамысловасьці.

Пачын «Палесдруку» падхоплены ўжо пралетарыятам СССР. Газэта «Труд» абвясьціла **ЎСЕСАЮЗНЫЯ ВЫТВОРЧЫЯ МАНЭЎРЫ.** Горача вітаючы ініцыятыву «Труда», мы лічым, што рабочая кляса БССР, сярод якой нарадзілася ідэя манэўраў, павінна **ПЕРШАЙ** уключыцца ва ўсесаюзны вытворчы паход, усюды арганізуючы ў сябе манэўры, мабілізуючы праз іх найшырэйшыя масы ў барацьбу за баявыя тэмпы, за самаправерку, за перавыкананьне заданьняў другога году, за сустрэчны прамфінплян надыходзячага ударнага кварталу.

Рабочыя прапановы—у жыцьцё

ПА ПРЫКЛАДУ ФРУНЗЕЎСКАГА РАЙКОМУ

АРГАНІЗУЕМ МАСАВЫЯ ПАХОДЫ ПРАВЕРКІ

З мэтай большага разьвіцьця рабочай ініцыятывы, забесьпячэньня дзейнасьці і рэалізацыі рабочых прапаноў, рашучай барацьбы з усімі праявамі правага апартунізму па практыцы, што перашкаджаюць рабочай ініцыятыве, бюро Фрунзэўскага РК КП(б)Б пастанавіла правесьці на працягу кастрычніка **МАСАВЫ РАЁННЫ ПАХОД ЗА РЭАЛІЗАЦЫЮ РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ.**

Першым днём паходу абвясьціць усесаюзны дзень ударніка—1 кастрычніка, з якой мэтай абавязаць усе ячэйкі раёну і фракцыі фабзаўкомаў па ўсіх агульна-гарадзкіх канфэрэнцыях і сходах рабочых у дзень ударніка паставіць пытаньне аб раённым паходзе за рэалізацыю рабочых прапаноў, растлумачыўшы шырока палітычнае значэньне вызначанага райкомам мерапрыемства.

Масавы паход за рэалізацыю рабочых прапаноў арганізаваць па раёне ў парадку ўзаемнай праверкі аднаго прадпрыемства другім, з гэтай мэтай на паказаных сходах рабочых вызначыць шырокія рабочыя брыгады (7-9 чалавек) з найлепшых ударнікаў заводу, якія-б канкрэтна ажыцьцяўлялі задачы паходу.

Стварыць пры РК штаб паходу па рэалізацыі рабочых прапаноў, даручыць агіт-масаваму аддзелу ў 3-дзённы тэрмін распрацаваць рад канкрэтных мерапрыемстваў па практычнай арганізацыі паходу.

РК ЛКСМБ распрацаваць патрэбныя практычныя мерапрыемствы па актыўным удзеле камсамольскай арганізацыі ў масавым паходзе па рэалізацыі рабочых прапаноў.

Усю работу па арганізацыі масавага паходу за рэалізацыю рабочых прапаноў увязаць з ЦСПСБ.

Прамфінплян выканалі 21 верасьня

Менская шчотачная фабрыка імя Крупскай да дня ўдарніка прыдзе з перавыкананьнем прамфінпляну на суму прыблізна 63.000 руб. Прамфінплян 1929-30 году ёю ўжо выкананы 21 верасьня. Зараз праводзіцца набор ударнікаў імя трэцяга году пяцігодкі. На фабрыцы ўжо ёсьць 4 такія брыгады са 107 рабочымі. У кожным цэху працуюць брыгады па праверцы выкананьня саздагаворэў.

У дзень ударніка будзе праведзена агульная канфэрэнцыя рабочых з пытаньнем аб выкананьні прамфінпляну 1929-30 году і падрыхтоўкі да новага году. 20 рабочых, якія далі лепшыя прапановы, будуць прэміяваны. На гэта адміністрацыяй адпушчана 600 рублёў.

Да дня ўдарніка прыстасоўваецца вылучэньне на гаспадарчую работу лепшых ударнікаў рабочых.

М. Ц.

Выканаем і якасныя заданьні

Фабрыка «Усход» выканала колькасныя заданьні 7-га верасьня, але ёсьць прарыў у зьніжэньні сабекошту.

Увесь калектыў мабілізаваў сябе на ліквідацыю прарыву да 1-га кастрычніка.

Дырэкцыя—ЛІБО.
Партбюро—МАНУСЭВІЧ.
Фабком—МІНЦ.

Раней на цэлы месяц

КАРТОННАЯ ФАБРЫКА ІМЯ ВАРОЎСКАГА ПРАМФІНПЛЯН 1929-30 ГОДУ ВЫКАНАЛА ЗА 11 МЕСЯЦАЎ.

ВЫПРАЦАВАНА 1.537 ТОН ПРАДУКЦЫІ СУПРОЦЬ ПЛЯНАВАГА ЗАДАНЬНЯ 1530 ТОН. САБЕКОШТ ЗЬНІЖАНЫ ПА ВЕРАСЕНЬ МЕСЯЦ НА 17,42 ПРОЦ., ШТО АЗНАЧАЕ ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ НА 1,42 ПРОЦ. ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ ЎЗЬНЯТА НА 55,32, ПРЫ КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАХ У 43.2 ПРОЦ.

ЗАВОДАКІРАЎНІЦТВА ЯФРЭМЕНКА.

Натхнёная праца жалезных брыгад

Каля варот заводу сабраліся камунараўцы на мітынг. Маленькая лаўка замяняе сабой трыбуну, а чорныя ад копаці рабочыя горача пра нешта гавораць.

Пасярэдку стаіць прыземісты шыракашчечы рабочы. Ён кажа пра будні заводу. Ліпень прарваў плян. «Для ліквідацыі гэтага прарыву патрэбна было многа сіл і энэргіі ўдарнікаў» — кажа ён. А ў адказ сотні ківаюць галовамі. Яны гэта адчуваюць, бо ім прышлося сваімі рукамі ліквідаваць прарыў.

На прымітыўнай трыбуне зьяўляецца тав. **Гэй.** Бурнымі воплескамі камунараўцы сустрэлі **сакратара ЦК КП(б)Б.**

Тав. **Гэй** гаворыць пра задачы дня ўдарніка, які павінен праверыць праграму дзеяньня заводу і ўсяго рабочага калектыву, кожнага ўдарніка. Гэты-ж дзень павінен паказаць нашу падрыхтаванасьць да трэцьцяга рашаючага году пяцігодкі.

— Ад нас патрабуюцца сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы.

Камунараўцы даказалі на справе што яны за бальшавіцкія тэмпы. Адказ камунараўцаў на водаву ЦК УсеКП(б) гаворыць аб адданасьці Ленінскай партыі.

Новы прыліў у «сквозныя» брыгады, 700 самаабавязацельстваў—не пакідаць заводу да канца пяцігодкі, абавязацельствы **ліквідаваць прарыў**—вось чым сустрэлі камунараўцы адозву Ленінскага ЦК. Заклік ускалыхнуў завод. Трывога была ўсюды: і ў цэху і ва ўдарных брыгадах і ў сталоўцы, у канторы, заўкоме.

— **Усе жылі аднымі імкненьнямі — ліквідаваць прарыў** — заяўляе тав. **Геньнік.** — Зараз цяжка сказаць лічбы, але ў выніку напружанае работы ўдарнікаў, усяго рабочага калектыву, можна прадбачыць, што ліпеньскі прарыў будзе ліквідаваны.

Сказалі сваё слова камунараўцы і па справе контр - рэвалюцыйнай арганізацыі, выкрытай ДПУ.

Рабочыя **Паўленка** і **Ганімаяр** заявілі, «на спробы клясавых ворагаў мы адкажам яшчэ большымі дасягненьнямі». У рэзалюцыі мітынг аднагалосна адзначыў: «**Ухваляючы рашэньне Калегіі АДПУ аб расстрэле контр - рэвалюцыянэраў, камунараўцы абяцаюць выканаць пастаўленыя перад імі задачы—узьняць сваю клясавую пільнасьць на ахову завАёў Кастрычніка».**

— **Узмацнім рабочы кантроль над органамі забесьпячэньня.** Вылучым 5 лепшых ударнікаў на работу ў загатоўчых арганізацыях — вось аб чым гаворыцца ў рэзалюцыі.

У адказ на паведамленьне тав. Гея аб пагрозах на фронце сяўбы—камунараўцы ухвалілі: «**Выхадныя дні адпрацаваць ў падшэфным калгасе».**

Нядарма ў сваім апошнім нумары «Камунаравец» пісаў, што «натхнёная праца жалезных брыгад, насустрач вялікаму пляну, напору паддасца любы непалад; любую залечым мы рану!

Л—іч.

Штодзённа адгружаць 700 вагонаў

СКОНЧЫЦЬ ЗАГАТОЎКУ І ВЫВАЗКУ ДА 10 ЛІСТАПАДА

Выкананьне гэтай баявой задачы патрабуе сапраўдных бальшавіцкіх тэмпаў работы

З 15 верасьня БССР уступіла ў перыяд узмоцненых бульба-загатовак.

З ураджаю бягучага году мы павінны загатовіць 660.000 тон бульбы, або 40 млн. пуд. У параўнаньні з мінулым годам плян загатовак павялічаны на 200 проц.

На працягу восені трэба загатовіць ня менш, як 460.000 тон, ці іначай кажучы, 30.000 вагонаў. За гэты-ж час з БССР у пралетарскія цэнтры СССР павінна быць вывезена ня менш 150.000 тон бульбы, акрамя забесьпячэньня прамысловасьці і гарадоў БССР. **НАБЛІЖЭНЬНЕ ХАЛАДОЎ ПАТРАБУЕ ЎСЮ РАБОТУ ПА ЗАГАТОЎЦЫ І ВЫВАЗЦЫ БУЛЬБЫ СКОНЧЫЦЬ НЕ ПАЗЬНЕЙ, ЯК ДА 10 ЛІСТАПАДА.** Гэта значыць, што для сваячасовага выкананьня пляну мы штодзённа павінны нагружаць і адгружаць да 700 ВАГОНАЎ бульбы.

Гэтыя лічбы выразна гавораць за тое, што кампанія па бульба-загатоўках сапраўды патрабуе бальшавіцкіх тэмпаў работы і неадкладнай мабілізацыі ўсёй грамадзкасьці гораду і вёскі на барацьбу за выкананьне плянаў.

Усе пляны даўно ўжо накіраваны на месцы. Адпаведныя дырэктывы аб мэтадах правядзеньня бульба-загатовак даны вышэйшымі органамі.

Ураджай бульбы бягучага году вельмі добры, і мы маем усе падставы лічыць, што **ПЛЯН БУЛЬБА-ЗАГАТОВАК ЦАЛКАМ РЭАЛЬНЫ.** Выкананьне яго залежыць выключна ад **АКТЫЎНАСЬЦІ, ЯКАЯ БУДЗЕ ПРАЯЎЛЕНА З БОКУ РАЁННЫХ, ПАРТЫЙНЫХ, САВЕЦКІХ І ГРАМАДЗКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ,** а таксама і ад таго, наколькі сваячасова будуць ужытыя шырокія працоўныя масы ў барацьбу за выкананьне плянаў.

Тэмп загатовак да гэтага часу зьяўляецца злачынна-марудным. НА 20-га ВЕРАСЬНЯ ПЛЯН АСЕНЬНІХ ЗАГАТОВАК БУЛЬБЫ ВЫКАНАНЫ ТОЛЬКІ НА 1 ПРОЦ.

Загатоўчыя арганізацыі, мясцовыя органы да гэтага часу яшчэ не ўсьвядомілі сабе тых труднасьцяй, з якімі ім прыдзецца сустрэцца і перамагчы ў гэтай кампаніі. У радзе месц панае поўная безадказнасьць і неразуменьне важнасьці бульбазагатовак. Такія адносіны да справы рабочага забесьпячэньня зьяўляюцца найгоршым відам апартунізму.

Маруднасьць у разгортваньні сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў кампаніі азначае зрыў бульбазагатовак і пагражае забесьпячэньню бульбай пралетарскіх цэнтраў і прамысловасьці. Гэтага мы ні ў якім разе ня можам дапусьціць.

З усёй бальшавіцкай цьвёрдасьцю, з поўным разуменьнем усёй важнасьці задач, якія стаяць перад намі і труднасьцяй, якія павінны быць пераможаны, нам трэба правесьці рад тэрміновых мерапрыемстваў.

Мясцовыя партыйныя органы павінны неадкладна стаць на чале кампаніі па бульбазагатоўках.

Уся грамадзкасьць павінна ўзяць пад контроль выкананьне ўсімі загатоўчымі арганізацыямі плянаў бульбазагатовак.

Зараз-жа трэба праверыць давядзеньне цьвёрдых заданьняў да кожнага калгаснага заможнага двара і забесьпечыць поўнае выкананьне гэтых заданьняў у вызначаны тэрмін.

Павінен быць неадкладна забесьпечаны ўдзел бяднякоў-серадняцкіх мас, актыўнейшы ўдзел грамадзкасьці ў выкананьні паселішчных плянаў у парадку самаабавязацельстваў.

Трэба забесьпечыць мабілізацыю калгасьнікаў і рабочых саўгасаў на поўнае і сваячасовае выкананьне калгасамі і саўгасамі сваіх абавязкаў па здачы дзяржаве пішкаў бульбы. Калгасы і саўгасы павінны стаць сапраўднымі арганізатарэмі кампаніі па бульбазагатоўках на вёсцы.

Бульбазагатоўкі сёлета павінна праходзіць пад лозунгам шырока-разгорнутага **САЦСПАБОРНІЦТВА НА ВЫКАНАНЬНЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ** як паміж саўгасамі і калгасамі, так і паміж асобнымі паселішчамі і бяднякоа-серадняцкімі дварамі, шляхам арганізацыі масавых чырвоных абозаў.

Сярод калгасьнікаў і бяднякоа-серадняцкіх мас трэба зараз-жа разгарнуць шырокую масава-растлумачальную работу за здачу добраякаснай **ПЕРАБРАНАЙ** бульбы. Ні ў якім разе нельга дапусьціць, каб паўтараліся памылкі мінулага году, калі галоўная ўвага месцы была зьвернута на колькасьць загатоўленай бульбы, а не на яе якасьць.

Буйны рост плошчы пад пасевы бульбы ў калгасах і саўгасах, недахват рабочых рук высоўвае задачу неадкладнага арганізаваць дапамогу калгасам і саўгасам у капаньні і пераборцы бульбы. У гэтай рабоце ім павінны дапамагчы прафсаюзныя арганізацыі і камсамол. Трэба неадкладна арганізаваць ударныя брыгады з работнікаў савецкіх устаноў, членаў ЛКСМ, жанчын.

Кулацкія і нэпманскія элемэнты, якія будуць весьці агітацыю супроць выкананьня плянаў, павінны атрымаць належны жорсткі адпор.

Чыгуначнікі і транспартнікі павінны дапамагчы сваячасова арганізаваць адгрузку і выгрузку бульбы.

Выкананьне плянаў па бульбазагатоўках яшчэ раз пакажа нашу згуртаванасьць вакол выкананьня задач, высунутых адозвай ЦК.

У паход за выкананьне плянаў бульбазагатовак!

АБРАМСОН.

Абсьледваньне работы КП(б)Б

НЕ ДАЎЛІЧВАЕЦЦА ЗНАЧЭНЬНЕ РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКАЙ РАБОТЫ

У пастанове XVI зьезду УсеКП(б) аб выкананьні пяцігадовага пляну прамысловасьці адзначана: «Сацыялістычная рацыяналізацыя, якая зьяўляецца лепшым сродкам мабілізацыі скрытых матутных рэзэрваў і зьніжэньня сабекошту, павінна стаць часткай практычнай работы ўсяго адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу прамысловасьці і быць у цэнтры тэхніка-вытворчай работы прадпрыемства. Дзеля гэтага ва ўсёй сыстэме прамысловасьці зьверху да нізу павінны быць добра ўмацаваны органы рацыяналізацыі».

У выкананьні гэтай пастановы ў прамысловасьці Беларусі зроблена надзвычай мала.

Сэктар з аднаго работніка

З боку прэзыдыуму ВСНГ, кіраўнікоў большасьці трэстаў і прадпрыемстваў нагадваецца павольнасьць, марудзнасьць, а то і абсалютная бяздзейнасьць. Прэзыдыум ВСНГ зьнімае лепшых рацыяналізатараў (загадчык рацыяналізацыі т. Ленін, інжынер Ламаф) перавядзіць іх на іншую работу і тым самым пакідае без кіраўніцтва вельмі важны вучастак сваёй работы. Сэктар рацыяналізацыі ВСНГ налічвае ў цяперашні час усяго толькі аднаго адпаведнага работніка.

Ня лепш стаіць справа і ў аб'яднаньнях і прадпрыемствах.

Ёсьць аб'яднаньні, якія да гэтага часу ня маюць спэцыяльных работнікаў рацыяналізатараў (Тэкстыльаб'яднаньне). Большасьць рацыяналізатарскіх ячэек ня маюць у сваім складзе інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу і эканамістых, што дрэнна адбіваецца на якасных паказальніках іх работы.

Кіраўнікі прадпрыемстваў ня ўмеюць, а часткова ня хочуць скарыстоўваць на рацыяналізатарскай рабоце лепшых сваіх ударнікаў, якія правялі сябе ў вытворчых камісіях, нарадах па вынаходзіцтве і г. д. Так, на гарбарні «Бальшавік» актыўны стары рабочы пасьля заканчэньня рацыяналізатарскіх курсаў скарыстоўваецца не па спэцыяльнасьці а працуе сакратаром заўкому.

На заводзе «Энэргія» рацыяналізатар заводу, рабочы вылучэнец т. Іваноў, з прычыны таго, што ня мае ніякага падтрыманьня з боку адміністрацыі, просіць, каб вярнулі яго да варштату.

„У мяне ня біржа працы"

Перад сацыялістычнай рацыяналізацыяй цяпер стаіць галоўная задача — барацьба са стратамі.

Вытворчае абсьледваньне раду прадпрыемстваў брыгадамі ЦСПСБ і ВСНГБ сьвяцілоўцы аб вялікай небясьпецы. Ёсьць гаспадарнікі, якія ад гэтай работы зусім адмаўляюцца, і разважаюць прыкладна так: «У мяне ня біржа працы, каб даваць людзей для барацьбы са стратамі. Барацьба са стратамі, гэта ліквідацыя, якая патрасе і перастане».

Ёсьць шмат прадпрыемстваў, якія ўкладаюць вялікія сродкі ў капітальнае будаўніцтва, а між тым шматлясічныя дэфэкты гніюць у адкідах. Такімі прыкладамі бесгаспадарчасьці могуць служыць Менская абутковая фабрыка, дзе на фольгу разрэзана скура, а якой можна было зрабіць 3.500 пар абутку, а фольгу трэба было рэзаць з абрэзкаў.

Віцебская абутковая фабрыка, якая за 10 месяцаў выканала 50 проц. прамфінпляну, толькі ад браку і незахаваньня гатунковасьці дае 2.500 руб. страт у дзень. Там-жа, з-за кепскага плянаваньня вытворчасьцю, у некаторых цэхах накапілася да 50.000 пар загатовак, якія доўгі час ляжаць без карысьці і псуюцца.

У сутарэньні Менскай абутковай фабрыкі ляжыць непатрэбны для прамысловасьці дрот і калодкі на суму 48.000 руб.

Міма рабочага вынаходніцтва

Вынаходніцтва і рабочыя прапановы не знайшлі належнага месца ў рабоце органаў рацыяналізацыі. Цяганіна і бюракратызм — частае зьявішча пры разглядзе і выкананьні рабочых прапаноў. На шэйнай фабрыцы «Кастрычнік» прапанова рабочага Скурчынскага з эканамічнай эфэктыўнасьцю ў 20.000 руб. марынуецца ў габінэтах адміністрацыі ўжо больш году. На Віцебскай абутковай фабрыцы за ўвесь час ніводная рабочая прапанова ў практыку ня ўведзена.

Ня лепш справа і з выдачай прэмій за лепшыя прапановы. Ня ўсе прадпрыемствы маюць спэцыяльныя фонды, а там, дзе гэткія ёсьць, не заўсёды скарыстоўваюцца па прызначэньні.

Будаўніцтва бяз плянаў і чарцяжоў

Калі паглядзець на будаўнічы фронт, малюнак той-жа самы.

У практыку Белдзяржбудаб'яднаньня ўкаранілася прывычка пачынаць будаўніцтва без канчатковага складзеных плянаў і рабочых чарцяжоў. Напрыклад, карпусы Унівэрсытэцкага гарадка пабудаваны ў ямах, з прычыны чаго выдаткоўваюцца сотні тысяч рублёў, каб зрэзьці з плянцу 1½ мэтровы пласт зямлі. Белбудаб'яднаньне, калі і займаецца рацыяналізацыяй, дык выключна па пытаньні структуры цэнтральнага апарату, пакінуўшы пабудовы бяспрытульнымі.

Усе гэтыя факты кажуць аб катастрафічным становішчы ў справе рацыяналізацыі ў прамысловасьці і будаўніцтве.

Дзе-ж карэньні?

У чым-жа справа? Дзе захоўваецца асноўная прычына наплявацельскіх адносін да справы рацыяналізацыі?

Уся бяда ў тым, што работнікі ВСНГ не зразумелі вялізарнейшай ролі рацыяналізацыі ў прамысловасьці. ВСНГБ не сканцэнтраваў навакол сябе лепшых рацыяналізатарскіх сіл. Прэзыдыум ВСНГ БССР, распусьціўшы сэктар рацыяналізацыі ў сябе, гэтым самым даў повад аб'яднаньням і прадпрыемствам лічыць гэтую работу, як работу другарадную значэньня.

НК РСІ павінен зацікавіцца гэтай справай і сурова пакараць тых, хто ўпарта супроцьдзейнічае рацыяналізацыі і тым самым зрывае пастанову партзьезду.

А. Шаўроў, Грэнадзёр, Балашоў.

Мабілізацыя сродкаў насельніцтва.

На 10 мільенаў рублеў

не аформлена падпіска на пазыку

Адміністрацыя Белдзяржстраху і камсод ВСНГБ не здаюць атрыманых узносаў

Налёт, праведзены НК РСІ, выявіў поўную бязьдзейнасьць нізавых камісій садзейнасьці і пасыўныя адносіны да пазыкі раду заводзкіх партыйных і прафэсыянальных арганізацый.

Пазыка «Пяцігодка — за чатыры гады», выпушчаная па ініцыятыве рабочых, сустрэла самае шырокае падтрыманьне з боку працоўных мас. У радзе калектываў рабочыя добраахвотна падпісваліся на 70-80 і нават 100 проц. месячнага заработку.

Адначасова з прыкладнымі вынікамі падпіскі, мы сустракаемся з фактамі зрыву рэалізацыі з-за бязьдзейнасьці камсодаў і адсутнасьці дапамогі з боку парт'ячэек і фабзаўкомаў. Ёсьць рад калектываў, дзе падпіска яшчэ толькі пачынаецца, дзе пазыкай не ахоплены сотні рабочых і служачых.

З-за бязьдзейнасьці камсодаў і бюракратызму адміністрацыі дагэтуль не аформлена асноўная маса падпіскі. Паводле апошніх вестак, па БССР з агульнай сумы падпіскі ў 12 млн. руб. дагэтуль афармлена першымі ўзносамі толькі 2 млн. руб. Такім чынам, 10 млн. рублёў лічацца толькі на паперы.

Налёт, арганізаваны 22 верасьня ЦКК НК-РСІ па ўсёй БССР, у тым ліку і па Менску, пры дапамозе рабочых-засядацеляй і курсантаў курсаў ашчадкасы, выявіў канкрэтных вінаватых, якія зрываюць афармленьне падпіскі на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады».

ЯШЧЭ НЕ РАЗВАРУШЫЛІСЯ

Рад устаноў да гэтага часу не правёў падпіскі, не гаворачы ўжо аб афармленьні; сьпісы не прадстаўлены ў крэдытныя ўстановы. Горш за ўсё стаіць справа па саюзе асьвятнікаў.

БДУ ня выканаў заданьня на 50.000 руб., **Камвуз** — на 15.000 руб., **політэхнікум** — на 15.000 руб., навукова-дасьледчы інстытут прамысловасьці — на 8.000 руб., калегіум ЦК КП(б)Б — на 15.000 руб., яўрэйскі і польскі пэдтэхнікумы — на 4.000 руб. і г. д.

Кіраўнікі знаходзяць розныя аб'ектыўныя прычыны, каб апраўдаць сваю бязьдзейнасьць. Прарэктар БДУ Хадзякоў заявіў: «Усе студэнты разьехаліся, я нічога ня ведаю, сьпісы недзе валяюцца ў прафкоме». У Камвузе 75 студэнтаў яшчэ не падпісаліся на пазыку.

У Менскім гарсавеце яшчэ не ахоплены падпіскай 50 работнікаў, у цэнтральным радзільным доме з 72 работнікаў падпісалася 86; у школе міліцыі з 121 курсанта, падпісалася — 52; узносы не сабраны; камсод чакае прыбыцьця новых курсантаў.

У Кастрычніцкім райкоме КП(б)Б падпіска не афармлена ўзносамі. У Ляхаўскай амбуляторыі толькі 50 проц. работнікаў ахоплены падпіскай, узносы ня ўтрыманы. Па каўбаснай фабрыцы з 53 рабочых ахоплены — 37. У абутковай арцелі «Чырвоны Абутнік» з 415 рабочых падпісалася 342, падпіска не афармлена, камсод не працуе, бо «старшыня паехаў у лягеры збор, а хто члены — мы ня ведаем».

Але, безумоўна, пярэдзтва на зрыў падпіскі трэба аддаць **камсоду гуты «Пралетары»,** які афіцыйна піша ў ашчадкасу: «У сувязі з тым, што наш завод яшчэ ня выплаціў поўнасьцю ўзносаў па 3-й пазыцы, мы першы ўзнос на новай пазыцы можам унесьці не раней 15 верасьня». Камэнтарыі да гэтага лісту непатрэбны.

ЗАВОДЫ «ЭНЭРГІЯ» І «БАЛЬШАВІК»—У ХВАСЬЦЕ

Завод «Энэргія» з агульнай сумы заданьня ў 45.000 руб. выканаў толькі 32.000 руб., ахоплена падпіскай толькі 54 проц. усіх рабочых і служачых. Дагэтуль яшчэ не пакрыта запазычанасьць па 3-й пазыцы ў суме 540 руб. Камісія садзейнасьці займаецца толькі тым, што мяняе сваіх старшынь. Толькі зараз, пасьля налёту, парт'ячэйка зацікавілася становішчам падпіскі і пастанавіла заслухаць гэта пытаньне на бюро.

З 775 рабочых заводу «Энэргія» падпісалася 693. Узнос у 1.549 руб. ня быў унесены на працягу 10 дзён. Камісія садзейнасьці да гэтага часу не перадала ў кантору сьпісы дадатковай падпіскі. Наогул камісія займаецца толькі тым, што дае дазволы на продаж аблігацый.

ГАНЕБНЫЯ ФАКТЫ ЗЛАЧЫНСТВАЎ

Налётам выяўлены выпадкі простага злачынства, якія патрабуюць хутчэйшай умяшальнасьці пракуратуры і судовых органаў.

Шавецкая арцель «Новы Шлях» трымала ў сабе з 6 па 21 верасьня 219 руб. узносаў на пазыку, тлумачачы гэта тым, што «арцель ня ведала, куды здаваць грошы». У касе Белмэталяаб'яднаньня з 14 па 20 верасьня трымалі спагнаныя 295 руб. Адміністрацыя Белдзяржстраху пералічыла ўзносы па пазыку на свой бягучы рахунак, бо «бухгальтар ня ведаў, каму здаваць грошы». Па калектыве Лесбелу не пакрыта яшчэ запазычанасьць па 3-й пазыцы на суму 217 руб., узнос па новай пазыцы на суму 712 руб., утрыманы ад варплаты за другую палову жніўня, яшчэ не ўнесены ў банк. У майстэрні Белдзяржбуду першы ўзнос быў утрыманы 10 верасьня, а зданы 22-га. Старшыня камсоду ВСНГБ Бароўскі трымае ў кішэні 183 руб. узносаў.

ПАРТ'ЯЧЭЙКІ І ФАБКОМЫ—У БАКУ

Як агульны недахоп у правядзеньні кампаніі, трэба адзначыць поўную адсутнасьць сацспаборніцтва ў рэалізацыі, слабую агітацыйную работу камсодаў. Пытаньне падпіскі на пазыку не ўвязывалася з бягучымі гаспадарча-палітычнымі кампаніямі.

Фабзаўкомы і парт'ячэйкі зусім ня сочаць за афармленьнем падпіскі і за работай камсодаў.

КРЭДЫТНЫЯ ЎСТАНОВЫ НЕ ПАСЬПЯВАЮЦЬ ЗА ТЭМПАМІ

Налёт быў праведзен і па Дзяржбанку, а таксама па 10 ашчадных касах з мэтай праверыць, што яны зрабілі, каб аформіць падпіску ў тых калектывах, да якіх яны прымацаваны. Выявілася, што фондавы аддзел Дзяржбанку працуе зусім незадавальняюча. Прадстаўнікі Дзяржбанку ні разу ня былі ў прымацаваных калектывах. Інструктаваньне камсодаў дрэннае. Трохі лепш стаіць справа па ашчадных касах.

Агульны вынік — крэдытныя ўстановы не пасьпяваюць за тэмпамі.

ДА І-ГА КАСТРЫЧНІКА СКОНЧЫЦЬ ПАДПІСКУ

Матар'ялы налёту будуць у бліжэйшыя дні абгавораны на пасяджэньні калегіі НК-РСІ. **Трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці ўсіх вінаватых у злачынным затрыманьні грошай, у бяздзейнасьці.** Трэба арганізаваць паказальны суд над бюракратамі з ВСНГБ, Белдзяржстраху, якія затрымліваюць дзяржаўныя грошы.

Адначасова, камсоды, парт'ячэйкі, фабзаўкомы павінны прыняць усе меры, каб на 1 кастрычніка скончыць і аформіць падпіску.

Л. Градзянскі.

Ход мабілізацыі сродкаў--нездавальняючы

Работу па мабілізацыі—на ўдарныя рэйкі

На чарговым пасяджэньні СНК пад старшынствам т. Галадзеда быў заслуханы даклад Наркамфіну аб ходзе мабілізацыі сродкаў насельніцтва. Савет Народных Камісараў прызнаў вынікі мабілізацыі сродкаў нездавальняючымі і адзначыў, што, ня гледзячы на тое, што да 1 кастрычніка застаўся толькі адзін тыдзень, не наглядаецца пералому ў рабоце па мабілізацыі сродкаў.

Важнейшыя дырэктывы СНК аб забесьпячэньні паступленьня ўсіх абавязковых і добраахвотных плацяжоў, асабліва па сялянскім сэктары, ня выкананы.

Па радзе плацяжоў сельскага насельніцтва заданьне зрываецца. Паступленьне страхавых сум вельмі нязначнае. Кампанія па самаабкладаньні зрываецца з-за павольнай падрыхтоўкі. Падпіска на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» ідзе нездавальняюча.

Афармленьне падпіскі злачынна зацягваецца. Рост укладаў у касы ашчадкасьці зусім нязначны, па шмат якіх раёнах наглядаецца нават адліў укладаў.

СНК, прызнаў, што каапэрацыя ня справілася з заданьнем па паняканленьні; у выніку плян збору паёў сарваны. Асабліва недапушчальную нядбайнасьць праявілі вытворчая сельска-гаспадарчая, жыльлёвая і саматужна-прамысловая каапэрацыя.

Грамадзкія арганізацыі, у першую чаргу, прафсаюзы не дабіліся сканцэнтраванья ўвагі савецкай грамадзкасьці на пытаньні мабілізацыі сродкаў.

Масы ня ўзьняты на барацьбу за выкананьне фінансавага пляну.

Савет Народных Камісараў запрапанаваў Калегіі НКЗС і спэцыяльнай сыстэме сельска-гаспадарчай каапэрацыі забесьпечыць сваячасовую і поўную аплату паёў і плацяжоў па ссудах крэдытных таварыстваў, не дапушчаючы пратэрміновак.

Савет Народных Камісараў прапанаваў Наркамфіну і Дзяржбанку, а таксама па 10 ашчадных касах з мэтай праверыць, што яны зрабілі, каб аформіць падпіску ў тых калектывах, да якіх яны прымацаваны. Выявілася, што фондавы аддзел Дзяржбанку працуе зусім незадавальняюча. Прадстаўнікі Дзяржбанку ні разу ня былі ў прымацаваных калектывах. Інструктаваньне камсодаў дрэннае. Трохі лепш стаіць справа па ашчадных касах.

Агульны вынік — крэдытныя ўстановы не пасьпяваюць за тэмпамі.

Ажывіць шэфства рабочых над апаратам

(На нарадзе ў ЦКК-РСІ)

24 верасьня ЦКК-НК-РСІ склікала шырокую нараду па пытаньні шэфства рабочых над савецкімі ўстановамі.

На нарадзе выступіў член ЦК УсеКП(б), прадстаўнік камісіі, якая праводзіць абсьледаваньне работы ЦКК-НК-РСІ БССР, т. **Штраух.**

Фактычна шэфская работа ў БССР пачалася ў часе чысткі савецкага апарату. Рабочыя масы прынялі актыўны ўдзел у чыстцы. У радзе ўстаноў, на месца вычышчаных з савецкага апарату чыноўнікаў, бюракратаў і наогул чужых і былых людзей, былі вылучаны рабочыя ад варштату. Шэфская работа значна ажывілася. Але як толькі скончылася чыстка, крывая шэфства пайшла ўніз.

Ня гледзячы на дырэктывы вышэйшых органаў, у шэфскай рабоце няма зруху.

Шмат хто да справы шэфства праявіў чыста дзяляцкі падыход, разглядаючы гэту работу, як чарговую кампанію. Была кампанія чысткі, рабочыя прынялі ў ёй актыўны ўдзел, вылучылі куды аднаго, а куды 2-х ці 3-х рабочых і на гэтым можна спыніцца. Так рабочыя заводу «Камунар», які шэфствуе над ВСНГ, прынялі актыўны ўдзел у чыстцы савецкага апарату, а далей у галіне шэфскай работы нічога не зрабілі.

Брыгада, якая абсьледвала шэфскую работу, цікавілася тым, як стаіць справа ў былых акруговых цэнтрах. Як выявілася пасьля ліквідацыі акруговых устаноў... ліквідавалася і рабочае шэфства.

Ні РСІ, ні прафсаюзы не аказалі арганізацыйнай дапамогі ў пераключэньні шэфскай работы з акруговых устаноў на гарадзкія. Наогул, органы НК-РСІ БССР не аддалі належнай увагі гэтай справе.

Партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі аказалі слабую дапамогу шэфскай рабоце.

Пасьля вылучэньня рабочых, якое было праведзена ў часе чысткі савецкага апарату — апарат больш не арабочаўся. Новыя рабочыя ня ўцягваліся ў шэфскую работу, а тым, якія раней працавалі ў гэтай галіне, ніхто не дапамагаў. Заводзкія арганізацыі не пакладзілі растлумачальнай работы па пытаньні шэфства. Гэта пытаньне разглядалася ў большасьці габінэтным парадкам і ня выносілася на агульныя сходы рабочых.

Партыйныя ячэйкі павінны былі кіраваць рабочымі шэфстам і адказваць за яго. Але ў большасьці яны да гэтага ня падыходзілі фармальна.

Прадпрыемствы Менску павінны былі паказаць прыклад іншым гарадам, як трэба праводзіць шэфскую работу, але гэтага яны не зрабілі.

Тав. **Самахвалаў,** які прымаў удзел у брыгадзе па праверцы вык

Латвійскі консул у Менску

23-га верасьня прыехаў у Менск, з мэтай наведаць Усебеларускую выстаўку, латвійскі консул п. Пунга. 24-га верасьня п. Пунга быў прыняты ч. в. а. упаўнаважанага НКЗС СССР пры ўрадзе БССР т. Янам Густыром.

Заўчора п. Пунга, разам з кіраўніком польскага генэральнага консульства ў Менску п. С. Забела, у суправаджэньні т. Густыра, наведаў Усебеларускую выстаўку.

Прыезд брыгады Маскоўскага радыёцэнтру

У Менску працуе ўдарная брыгада маскоўскага радыёцэнтру ў складзе т. т. Анцыфрава, Палікарпава і Шамбадала. Брыгада абсьледуе работу беларускага радыёцэнтру і пастаноўку радыёвяшчаньня. Брыгада просіць радыёслухачоў і рабкораў дапамагчы ёй у рабоце.

Мопраўскія арганізацыі без кіраўніцтва

Мопраўскія арганізацыі да апошняга часу па пытаньнях правядзеньня інтэрнацыянальнай выхаваўчай работы сярод працоўных, іх удзелу ў самадзяйнасьці, а таксама па правядзеньні маральнай і матар'яльнай дапамогі палітзьняволеным, займалі адно з першых месц сярод іншых грамадзкіх арганізацый.

Гэтае становішча мы мелі, галоўным чынам, дзякуючы адчуваньню з боку шырокіх колаў мопраўцаў пэрсанальнай адказнасьці за выкананьне ўсіх задач, якія стаяць перад МОПР'ам. Зусім інакш стаіць справа з кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту МОПР'у. **За апошні час, асабліва ў момант правядзеньня лін відацыі акруг, усякае кіраўніцтва з боку ЦК МОПР'у адсутнічае.**

ЦК МОПР'у ня выканаў пастановы партыі аб укамплектаваньні Цэнтральнага Камітэту інструктарамі і таму ня дзіўна, што перавыбарчая кампанія мопраўскіх кіруючых органаў праходзіць вельмі дрэнна. Есьць шмат ячэек, дзе перавыбары яшчэ не пачаты. У г. Віцебску праводзілася гарадзкая мопраўская канфэрэнцыя і калі віцебская арганізацыя МОПР'у патрабавала, каб ЦК МОПР'у выдзеліў на гэту канфэрэнцыю свайго прадстаўніка, дык яе патрабаваньне засталося пустым гукам.

Калі ў веснавой пасеўнай кампаніі мопраўскія арганізацыі амаль што ва ўсіх раёнах прымалі актыўны ўдзел, дык у цяперашняй асеньняй кампаніі, за выключэньнем 2-3 раёнаў, мопраўскімі арганізацыямі нічога ня робіцца.

Большая колькасьць ячэек працуе бяз плянава і шмат палітычных кампаній, як дзень МЮД'у і інш. праходзяць міма мопраўскіх арганізацый. **Сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў большай частцы ячэек існуе толькі фармальна.** Выкананьне ўзятых на сябе абавязацельств па сацдагаворах не правяраецца. Яшчэ горш стаіць справа ў тых раёнах, дзе акруговыя камітэты ліквідаваны, а раённыя яшчэ не абраны. У тых раёнах ячэйкі прадастаўлены самі сабе і ніхто імі ня кіруе.

Для таго, каб ад ліквідацыі акруговых камітэтаў МОПР'у не атрымалася ліквідацыя мопраўскіх арганізацый, **партыйныя арганізацыі павінны ў хуткім часе дапамагчы правесьці перавыбарчую кампанію** з тым, каб забясьпечыць гарадзкія і вясковыя раённыя камітэты МОПР'у адпаведнымі кіраўнікамі. ЦК МОПР'у павінен таксама забясьпечыць сябе інструктарамі, якія-б сапраўды мелі жывую сувязь з ячэйкамі і дапамагалі ім у іх штодзённай рабоце.

БРАЙНІН.

Пастанова Наркампрацы БССР

аб пашырэньні кола асоб, якія рэгіструюцца на біржах працы

У мэтах павялічэньня ліку асоб, уцягнутых у вытворчую працу ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы, Народны Камісарыят Працы БССР пастанаўляе:

1. Пашырыць кола асоб, якія рэгіструюцца на біржах працы, шляхам прыняцьця на вучот наступных катэгорый, не пазбаўленых выбарчых праў:

а) жонак рабочых і служачых,—членаў прафсаюзаў;

б) жонак вайсковых служачых, работнікаў ДПУ, вазнізаванай аховы, міліцыі і г. д.;

в) жонак інвалідаў працы і вайны, якія атрымліваюць пэнсію з органаў сацстраху, або сацыяльнага забесьпячэньня;

г) гараздной беднаты, па даведках гаркамітэту ўзаемадапамогі;

д) дзяцей інвалідаў вайны, саматужнікаў, гарадзкой беднаты, па дакументах бацькоў;

е) утрыманцаў рабочых і служачых (з ліку братоў і сясьцёр) па даведках фабзаўкомаў і лекавых кніжках;

ж) батракоў і іх дзяцей, па даведках прафсаюзных арганізацый або сельсаветаў.

2. Калгасьнікі бяруцца на вучот з дазволу праўленьня калгасу, вясковая беднота па даведках камітэтаў сялянскай узаемадапамогі, або сельсаветаў.

3. Перапічаныя ў пунктах 1 і 2 асобы бяруцца на вучот ва ўзросце: мужчыны ад 18 да 50 год, жанчыны—ад 18 да 40.

4. Пры рэгістрацыі на біржы працы трэба прадставіць наступныя дакументы:

а) жонкі рабочых і служачых, вайскова-служачых—прафсаюзны білет, або вайсковую кніжку;

б) жонкі інвалідаў пэнсіённыя кніжкі мужоў.

5. Усе паказаныя асобы бяруцца на вучот на гарадзкіх біржах працы або па месцы свайго пастаяннага жыхарства (райінспэкцыі працы).

6. Асобы, узятыя на вучот органаў працы, паводле гэтай пастановы, няпікімі ільготамі па беспрацоўі і аказаньні працоўнай і матар'яльнай дапамогі ад органаў сацстраху не карыстаюцца.

Батракі карыстаюцца ільготамі па беспрацоўі і інш. відамі дапамогі ад органаў сацстраху, паводле існуючага заканадаўства.

Нам. Наркампрацы БССР ЗАХАРАВА.
Старшы Інспэктар НКПБ РАДЫЁНАЎ.

За дзень

— У канцы кастрычніка ў Менску склікаецца **V усебеларускі зьезд саюзу рабочых папяровай прамысловасьці.**

— У сьнежні ўсесаюзнае электрычнае аб'яднаньне прыступае да **электрызацыі абсталяваньня цэмэнтнага заводу ў Крычаве і пабудовы** станцыі магутнасьцю ў 6.000 кілёват.

— У бліжэйшыя дні ў Менску склікаецца **вытворчая канфэрэнцыя будаўнікоў**, на якой будзе стаяць пытаньне аб капітальным будаўніцтве бягучага сэзону і аб падрыхтоўцы да сэзону 1931 году.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ, 26 верасьня.

— **Дом Асьветы.** А 7 гадз. увеч. адбудзецца адкрыты сход цэх. ячэйкі КП(б)Б школьных устаноў. У парадку дня: плян працы Дому Асьветы на асеньня-зімовы пэрыяд і бягучыя справы. Запрашаюцца асьветнікі гораду.

— **БДУ.** А 8 гадз. 30 м. у габінэце эканомікі (гал. корпус) адбудзецца адкрыты сход яч. КП(б)В Наркасу. Парадак дня: 1) Інфармацыя штабу па ліквідацыі прарываў у вучобе. 2) Вынікі работы студэнтаў у саўгасах. Запрашаюцца студэнты і навук. працаўнікі факультэту.

— Заняткі на ўсіх аддзяленьнях 5 і 7 курсаў факультэту **Наркасу** пачынаюцца сёньня, а 8 г. раніцы. Прапануецца ўсім выкладчыкам своячасова пачаць працу. Лічбы і гадзіны заняткаў згодна раскладу заняткаў.

— **Дом Камасьветы.** А 8 гадз. увеч. адбудзецца даклад для [illegible] камсам. актыву «Сучаснае становішча [illegible] Нямеччыне». Пасьля — мастацкая [illegible]. Білеты на РК КП(б)Б і ў чытальню.

— А 7 гадз. увеч. пасяджэньне жансэкцыі **Фрунз. РК МОПР'у** у памяшк. б. Акругкому МОПР'у. Яўка членаў жансэкцыі абавязкова. Запрашаецца жактаўскі актыў.

— **Камвуз.** Запіс на праміатавары з папярэднім унясеньнем авансу працягваецца да 27 верасьня. Запіс у т. Інасавай.

А 7 з пал. гадз. увеч., адбудзецца пасяджэньне **бібліятэчнага савету** цэнтр. біб-кі імя А. С. Пушкіна (Кастрычніцкая, 5). Парадак дня: 1) Становішча перасовачнай і кніганошаўскай работы, у зьвязку з паліпэнізацыяй школы; 2) Інфармацыя аб работе яўрэйскай і Лошыцкай хат-чытальняў; 3) Розная. Яўка членаў бібсавету абавязкова. Запрашаюцца прадстаўнікі прадпрыемстваў і школ.

— **Вячэрні рабочы ун-т.** 27 верасьня, а 7 гадз. увеч., пачынаюцца заняткі другога курсу грамадазнаўчага аддз. вяч. раб. ун-ту. Заняткі адбудуцца ў прыродазнаўч. корпусе (Зямляробскі зав. № 4). 28 верасьня, а 7 газ. увеч., у прыродазнаўч. корп. (Зямляробск. зав. № 4) у пакоі № 1, склікаецца агульны сход новапаступаючых студэнтаў у вяч. раб. ун-т. Яўка ўсіх студэнтаў абавязкова.

Фрунзаўскі РК КП(б)Б паведамляе, што з 27-га верасьня па 1-га кастрычніка пачынаецца прыём у раённую першапачатковую партыйную школу.

Усе запісаўшыяся т. т. наступных ячэек павінны зьявіцца ў памяшканьне 4-й школы (супроць бульвару) а 7-й гадзіне ўвечары, маючы на руках рэкамэндацыі ячэек.

Сварняжная фабрыка, Друкарня СНК, Уціль, Менбуд, Фабрыка рымароў, Будаадзяленьне БЖС, Сталовыя МІРК, НКЗем, НКПрацы, НКАсьветы, НКгандлю, ВСНГБ, ЦВК, СНК, Дзяржплян, Міліцыя, Белдарпрас, Белдзяржстрах, Абкамтрэст, Папертрэст, Лесбел, Белпайгандль, В. О., Нарсувязь, Гарсавет, Мэталаўстановы, Белдзяржкіно, Паліклініка, 1-я Сав. Больніца, 2-я Сав. Больніца, Гар. КСГУ, П/К Рэдакцыі.

— **Фрунзаўскі РК КП(б)Б** паведамляе, што 28-га верасьня, а 7 гадз. ўвечары ў памяшканьні Культпропу РК адбудзецца нарада ўсіх прапагандыстых партыйнай сеткі Райкому па пытаньні аб [illegible] вучобы.

На нараду павінны зьявіцца наступныя таварышы:

Лебедзеў Д. Т., Шамес С. А., [illegible]даў Н. П., Гэўрасеў А. П., Войпе[illegible] М. П., Худзейка А. В., Кулінёнка Т. [illegible] Бароўскі З. А., Кучураў В. З., Лес[illegible] А. М., Капуцкі А. Р., Лу[illegible] Клімаў І. Ф., Каржыцкая Н. І., [illegible]віч І. П., Міновіч А. Ц., Нафтолін С. І., Прусьлін Я. В., Салаўёў Р. М., Салдаценка А. І., Сталін Х. Л., Стэфановіч П. В., Тоўсьцік І. Б., Фрадзін Я. Л., Вэрнік І. А., Гарбунаў Ц. С., Кацэльсон Л. Б., Ліпкін Р. А., Левін Л. М., Львовіч Д. А., Ляхаў Т. А., Лебедзеў С. Я., Мацюкоў П. В., Путачоў С. Х., Пракаповіч Л. С. (Камвуз), Шмідт (Белвёска), Спэктар (СНК), Вержбаловіч («Зьвязда»), Турбовіч, Эфраімская (Будаўнікі), Мацеліна (Прыгарадны сельсавет), Гароў (Лесбел), Рак (Эльвод), Казуноў (БАН), Лунец (СНК), Сухароў («Зьвязда»), Фарбар, Фрыдман (СНК), Вітлін (БДВ), Канэр (Беларусь), Вайбэрг («Камунарка»), Гоўзман («Пралетары»), Літвіновіч (Наркамгандлю), Сандлер (Белдзяржстрах), Фрыдлянд (Працасьветы), Лазаренка, Зарэмскі, Сініцкі (НКАсьветы), Раздзераў (Белдзяржстрах), Ажгэрэй (Пэдфак), Кульбакоў (завод «Камунар»), Шыф, Герасімчык, Зонэнштэйн, Гершановіч, Раўніцкі.

Яўка ў парадку партыйнай дысцыпліны абавязкова.

— **Фрунзаўскі РК КП(б)Б** пачынае камплектаваньне настаўнікаў для Вячэрніх Партыйных Школ па наступных прадметах: матэматыка, геаграфія і беларуская.

Жадаючыя настаўнікі павінны зьявіцца ў Культпроп Райкому, пакой № 19 штодзённа ад 12-ці да 2-х гадзін дня.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІН.

Нарада актыву МОПР'у

У нядзелю, 28 верасьня, а 7 гадз. увечары ў памяшк. ЦК МОПР'у

АДБУДЗЕЦЦА

НАРАДА МОПРАУСКАГА АКТЫВУ

Парадак дня будзе абвешчаны на нарадзе

На нараду запрашаюцца ўсе члены і кандыдаты б. Менскага ЯК МОПР'у: т. т. Вайнтраўб, Робіраут, Янушкевіч, Ліпманава, Файнштэйн, Протас, Шкляр, Бернацкі, Канстанцінаў, Каплан, Гітліц, Каган С., Кірьянер і Салаўёў, узяльнікі мопр-брыгад па арганізацыі чырвоных абозаў у Падгайскім і Сеніцкім сельсаветах, а так сама ўсе члены і кандыдаты Фрунзаўскага і Кастрычніцкага РК МОПР'у.

ПРОСЬБА ЗЬЯВІЦЦА СВАЯЧАСОВА

ЦК МОПР БССР.

КАСТРЫЧНІЦКІ РК КП(б)Б склікае на **28** верасьня а **6** гадз. увеч., у памяшк. **райкому**

нараду сэктараў вучобы і ўсіх прапагандыстых раёну

па пытаньні

аб пачатку навучальнага году у партшколах.

Мастацкі **ЦЫРК** | Пад кіраўніцтвам І. Л. СТРАШЭВІЧА

Пятніца, 26-га і субота, 27 верасьня

Грандыёзныя прадстаўленьні.

НОВЫЯ ГАСТРОЛІ.

Бытавыя вясёлыя начпільшчыкі **5 ЮРАВЫ.**

Музычныя сатырыкі **РЫМРОМ.** | Гладыятары рымляне **4 ЦАППА**

Чалавек з таямнічымі рукамі Ілюзіяністы **ЭД. РАЙЦЭЦІ.**

Турністы **4 Альтэнс.** | Эквілібрыстыя **2 Рауш.**

І шмат іншых нумароў.

Пачатак роўна а 8 г. увеч.

Праграма ў 3-х аддзяленьнях.

Адказны кіраўнік І. Л. СТРАШЭВІЧ.

Кіно-тэатр „Культура“ — Грандыёзны мастацкі баявік вытворч. „Межрабпом-фільм“ **Сьвята сьвятога Ёргена** ў 7 частках. Пачатак сэансаў: а 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м. Каса адкрыта ад 5 гадз.

КІНО пэрэрацыянал — **Новы фільм у 5 частках ГІГІЕНА ЖАНЧЫНЫ** Штодзённа 4 сэансы. Пачатак: а 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м. Каса—з 5 гадз. увеч.

Кіно „Пралетары“ — Новы-земскі фільм вытворч. „Лес-фільм“ **КАХАНЬНЕ МАРАКА** драма ў 7 част. Пачатак сэансаў: 1—7 г., 2—8 г. 30 м., 3—10 г. Каса—адчыненa з 5 г. увеч.

Дзіцячы кіно-тэатр „Юны піянэр“ — Новы фільм, вытворч. «САЮЗКІНО» **ЛЯГАВЫ** ШТОДЗЕННА 2 СЭАНСЫ. Пачатак 1-га сэансу а 2 г. дня, 2-га „ а 3 „ 30 м. Каса адчынена ад 12 гадз. дня.

Кіно „Спартак“ — Амэрыканскі трукавы фільм **НЕБАСКРОБ** у 6-ці частках. Пачатак сэансаў: **7 г., 9 г., 10 г. 45 м.** Каса—з 6 гадз.

РАБОЧИЙ, ИНЖЕНЕРНО-ТЕХНИЧЕСКИЕ РАБОТНИКИ!

ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ, что началась стройка крупнейшего в мире завода черной металлургии и коксо-химического комбината **„МАГНИТОСТРОЙ“**

ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ, что при этом гиганте строится новый социалистический город на сто пятьдесят тысяч человек населения?

ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ, что для строительства гиганта, который в 1932-33 г. должен дать стране 2 с пол. млн. тонн чугуна, 6 миллионов тонн руды, и дюжину не ли кокса (такого количества потребуется стройка на один завод в мире), **инженеры, техники и административно-технические работники** для того, чтобы строительство окончить в срок, намеченный XVI партийным с'ездом.

ПОМНИТЕ, что успех индустриализации страны зависит от успешности строительства Магнитостроя **„МАГНИТОСТРОЯ“**

ЭНТУЗИАСТ-РАБОЧИЙ, ИНЖЕНЕР, ТЕХНИК!

Строительство ждет твоего непосредственного участия в великой стройке. Условия и льготы можно получить по адресу: **Москва**, Моховая, № 28, **Бюро Кадров и Рабсилы „Магнитостроя“.** Наем рабочих производится в Москве и в соответствующих городах, при Отделах Труда, где имеются уполномоченные „Магнитостроя“, а также путем присылки заявления по указанному адресу.

Рабочий, ты должен знать условия работы

1. Условия зарплаты: все работы производятся сдельно; расценки на сдельные работы—московские.
2. На строительстве рабочие и служащие снабжаются по нормам Москвы.
3. Рабочие, проработавшие год, получают в качестве премии заработка, отчисляемого в размере среднего месячного заработка.
4. Дорожные расходы оплачиваются полной мере и обратно при условии работы на строительстве не менее шести месяцев.
5. Во время пути выдаются суточные в размере среднего месячного заработка на весь путь.
6. В пути рабочим выдаются продукты: хлеб, сахар, папиросы, селедки, консервы.
7. Каждому рабочему за время с момента прекращения работ на старом месте до момента начала работ на новом месте строительством по приезде на места уплачивается полного расчета среднего заработка рабочего на месте работы.

„Бюро Магнитостроя“ Москва, Моховая, 28.

ШВЭЙНАЯ ФАБРЫЦЫ «КАСТРЫЧНІК» **патрэбны 2 ламавыя кані** з усёй упражнэю і вазамі. З [illegible] спатрэбацца на фабрыку штодзённа ад 10 гадз. [illegible]ніцы да 4 гадз. дня.

Усім аб'яднаньням, трэстам, прампрадпрыемствам, дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям

Вопыт мінулага пэрыяду паказвае, што заданьні на праектаваньне і будаўніцтва чыг. ветак нармальнай і вузкай калеі, канатных, шосавых і брукаваных дарог і інш. транспартных пабудоў паступаюць з вялікім спазьненьнем.

Назначныя тэрміны выкананьня адбіваюцца на эканамічнай і тэхнічнай якасьці праектаў і на кошце будаўніцтва.

Загадам па ВСНГ СССР ад 31-га мая 1929 г. № 800 было прапанавана скапцэнтраваць вышэйпералічаныя будаўніцтвы і праектаваньні ў «Трансстрое».

Каб унікнуць паўтарэньня мінулых няўвязак,

ТРАНССТРОЙ

папярэджвае, што ён ня зможа прымаць работы на 1930-31 г., на якія ня будуць своячасова заключаны дагаворы, бо ў гэтым выпадку ён будзе пазбаўлены магчымасьці забясьпечыць спозьненыя заданьні дакладна прапрацаванымі праектамі, дастатковым тэхнічным персаналам, рабсілай і абсталяваньнем, а таму неабходна

неадкладна даць заданьне Беларускай канторы--Магілеў, Быхаўская, № 34.

«ТРАНССТРОЙ»

Галоўнае кіраўніцтва шосавых і грунтавых дарог і аўтатранспарту БССР

ГЭТЫМ АБВЯШЧАЕ, ШТО

працягваецца прыём у Аршанскую школу

„ДОРСТРОЙУЧ“

па падрыхтоўцы мэханікаў-машыністых і цесьляроў.

Тэрмін навучаньня 2 гады. У «Дорстройуч» прымаюцца асобы абодвага роду, скончышыя 7-годку, вячэрнія школы рабочай моладзі і школы сялянскай моладзі, а таксама і асобы, якія маюць адукацыю за 4, 5 і 6 груп 7-гадовай школы. Узрост 16-18 год. Паступаючыя павінны прысылаць наступныя дакументы: пасьведчаньне аб адукацыі, анкету, засьведчаную РВК або адпаведнай установай, мотрычную даведку, даведку аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў, даведку аб с.-г. падатку ў 1930 г. (для сялян); даведку аб выбарчых правах, даведку аб стане здароўя і фізычным разьвіцьці. Усе залічаныя ў школу «Дорстройуч» задавальняюцца стыпэндыямі ў суме 25 руб. у месяц і інтэрнатам.

УВАГА: У школу «Дорстройуч» залічваюцца рабочыя, батракі, батрачкі, дзеці рабочых, беднаты, калгасьнікаў, служачых, саматужнікаў, якія знаходзяцца ў каапераваных аб'яднаньнях, і дзеці ўсіх тых, хто не пазбаўлены выбарчых праў.

Заявы прымаюцца ў канцылярыі школы (г. Ворша, Леніньская вул. № 57) штодзённа ад 12 да 16 гадз. дня, да 5-га кастрычніка 1930 г.

Галоўдартранс БССР.

ХЭМІКА-ТЭХНАЛЁГІЧНЫ ІНСТЫТУТ

абвяшчае, што пачатак заняткаў для студэнтаў, прынятых на I КУРС (усіх спэцыяльнасьцей)

І-га настрычніка а 8 гадз. раніцы.

Загадваю ўсім залічаным студэнтам абавязкова зьявіцца не пазьней 30-га верасьня раніцой для размеркаваньня па інтэрнатах і для атрыманьня адпаведных інструкцый.

Тыя, хто не зьявіцца бяз уважлівых прычын у вызначаны тэрмін, будуць ВЫКЛЮЧАНЫ з ліку студэнтаў.

Дырэктар хэміка-тэхналёгічнага інстытуту КУНІЦА.

БЕЛАРУСКІ

МЭХАНІКА-МАШЫНА-БУДАЎНІЧЫ ІНСТЫТУТ у ГОМЕЛІ

паведамляе, што асобы, залічаныя студэнтамі **1-ГА НАБОРУ ІНСТЫТУТУ**, павінны зьявіцца ў інстытут **1-ГА КАСТРЫЧНІКА** г. г. а 9 гадз. раніцы, у памяшканьне был. будынку кі аўдыт[illegible]. Заход. чыг. для накіраваньня на 20 дзённы лятэрны збор.

Лятэрнаму збору не падлягаюць: жанчыны, сярэдні, старэйшы і вышэйшы начскład запасу РСЧА, якія павінны зьявіцца к пачатку тэарытычных заняткаў 21 **КАСТРЫЧНІКА**, а 9 гадз. раніцы.

Дырэктар інстытуту ВОЛКАЎ.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ ЎЗАЕМАДАПАМОГІ

Леніньская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў,

АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. вач.

Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях: па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, вушных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.

Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.

Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) **адкрыт з 6 г. да 8 г. увеч.**

ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. веч. штодзённа

Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.

Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запіс з 9 гадз. раніцы да 9 гадз. веч.

Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную дыфэрэнцыяваную плату.

Лёзьненскі і Дрысенскі ільназаводы

— аб'яднаньня ільнапяньковай прамысловасьці ВСНГ БССР —

пачынаюць з 1-га кастрычніка г. г.

прыём ТРЭСТЫ

(вымачанай або сланай ільняной саломы)

Умовы прыёму зьмешчаны ў разасланых па сельсаветах абвестках

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА“ звяраю па тэл. 7-81

ЗГУБЛЕН білет чырвонага партызана БЯРДЗІЧЭЎСКАГА Е. І., выд. Адэскім ваенкаматам. Лічыць несапраўдным.

Да ведама ўсіх райкалгассаюзаў і калгасаў БССР

На падставе заключанай умовы паміж **«Оргстроем» і Белкалгасцэнтрам**

забесьпячэньне калгасаў усякімі кнігамі і блянкамі

па рахункаводзтве і справаздачнасьці на 1930-31 г.

ПЕРАЙШЛО Ў ВЕДАМА „ОРГСТРОЯ“.

Каб на [illegible] своячасовым забесьпячэньні, просьба да ўсіх калгасаў **НЕАДКЛАДНА ПРЫСЛАЦЬ СВАЕ ЗАКАЗЫ** ў адрас «ОРГСТРОЯ» (Менск, Савецкая, 55). Бланкі заказаў рассылаюцца «ОРГСТРОЕМ» усім калгасам.

Белкалгасцэнтр Агранаўскі. Бел. к-ра «Оргстроя» Левін

АДДЗЕЛУ КАДРАЎ ВСНГ БССР

ПАТРЭБНЫ ВЫКЛАДЧЫКІ па фізыцы і матэматыцы

для школ ФЗВ на выезд.

Аплата 200—250 руб. у месяц.

Зьвяртацца ў аддзел кадраў ВСНГБ, пакой № 12, ад 2-х да 4-х гадз. дня, тэл. № 14-33.

БЕЛАРУСКІ

дзяржаўны будаўнічы інстытут

абвяшчае

1. Заняткі асеньняга набору пачнуцца 1 кастрычніка г. г. а 8 гадз. раніцы.
2. Прапануецца ўсім студэнтам будаўнічага інстытуту і электра-тэхнічнага факультэту **30 ВЕРАСЬНЯ** а 12 гадз. дня зьявіцца ў памяшканьне інстытуту (Універсытэцкі Гарадок, былы хэм. корпус БДУ)

Дырэкцыя інстытуту.

Вышаў з друку, разасланы ўсім падпісчыкам і паступіў у розьнічны продаж

№ 25 (верасень) часопісі

„Беларуская РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА“

ЗЬМЕСТ НУМАРУ:

1. За цесную сувязь перавыбарчай кампаніі з практычнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва.
2. Я. Г.—Шырэй і далей глядзець. Аб рашэньнях XVI зьезду па сельскай гаспадарцы.
3. ЯЗЭП ВАЗЕРНЫ—«Нашы дні» (ліра-паэма).
4. Н. ЗАЯЦ — «Па-бальшавіцку правядзем асеньнюю сяўбу».
5. МІКУЛІЧ—«Ліквідацыя акруг наблізіць партыйна-савецкі апарат да мас».
6. ЗОРКАЯ—«Працуюць па-ўдарнаму»
7. Да навучальнага году яшчэ не падрыхтаваны.
8. Матар'ялы з месц.

а) ПЯТРУСЬ ХВАЕВЫ—«Прыбыў першы абоз».
б) » » —«Падпісаліся на пазыку».
в) А. ЮШКЕВІЧ —«Бярэце прыклад»
г) С. —«Нічога ня ведаюць аб пазыцы»
д) Г. М. —«Выцікі ёсьць»
е) С. —«Праца няма»
ж) ДЭЛЕГАТКА —«Праца занядбала»
з) С. —«Трэба ліквідаваць нянісьменнасьць».
і) Гэта Я. —«Часопісь дапамагла наладзіць працу».

9. БЕРАЗОЎСКАГА—«Маці» (праграм).
10. Д-р ПОЛЯК—«Вэнэрычныя хваробы ў жанчыны» (праграм).
11. Што зроблена па дошках рабселькорак.
12. Тлумачэньне да выкрайкі.
13. Адказы на запытаньні.

Часопісь выходзіць 3 разы ў месяц.

Падпіску можна здаваць на пошту, лістаносцам, ў кіёску ці прысылаць ў выдавецтва «Зьвязда» (Савецкая, 63).

ЧАСОПІСЬ КАШТУЕ: 1 месяц 20 кап. Паўгода 1 р. 20 к. 3 » 60 » Год 2 » 40 к.

Цана асобнага нумару 10 кап.

Адрас рэдакцыі: Менск, вул. Энгельса № 28 тэлефон—5-85.

На 2-е кастрычніка, а 6 гадз. увеч., у памяшк. Беларускага Хэміка-Тэхналёгічнага інстытуту (Зямляробскі зав., 4)

ВСНГБ і хэміка-тэхналёгічным інстытутам

СКЛІКАЕЦЦА

КАНФЭРЭНЦЫЯ

на пытаньні:

„Становішча падрыхтоўкі вышэйшага і сярэдняга тэхнічнага складу для хэмічнае прамысловасьці“

На канфэрэнцыю, у абавязковым парадку, вылучаюцца па два прадстаўнікі (дырэктар або намесьнік і адзін інжынэр) ад наступных гаспадарчых аб'яднаньняў:

1) Хэмаб'яднаньне, 2) Паперааб'яднаньне, 3) Торфааб'яднаньне, 4) Шкловаб'яднаньне, 5) Белсельпрамаб'яднаньне, 6) Скураб'яднаньне, 7) Ільнапяньковае аб'яднаньне.

Запрашаюцца прадстаўнікі камітэту па хэмізацыі СНК, Інстытуту прамысловасьці, Наркамзему і ЦС Асоавіяхіму.

Прысутнасьць студэнтаў хэмінстытуту і старшых курсаў хэмічнага і тарфянога тэхнікуму абавязкова.

Нам. Старшыні ВСНГ **Страноўскі.**

Дырэктар Беларуск. Хэміка-Тэхналёгічнага Інстытуту Куніца.

МЕНГАРКАМІТЭТ УЗАЕМАДАПАМОГІ

(вул. Бакуніна, 1-43),

У сувязі з наступленьнем зімовага пэрыяду, для выяўленьня патрэб беднаты ўсіх нацыянальнасьцей,

абвяшчае рэгістрацыю гарадзкой беднаты і перарэгістрацыю тых, якія ўжо лічацца на вучоце ў камітэце, а таксама членаў б. т-ва „ЕМСО“.

Парадак перарэгістрацыі наступны:

Літары: А, Б,—23-IX, В, Г—24-IX, Д, Е,—25-IX, Ж, З, І—26-IX, К, Л, М,—27-28-IX, Н, О,—29-IX, П, Р,—30-IX, С, Т,—1-X, У, Ф,—2-X, Х, Ц,—3-X, Ч, Ш,—4-X, ШЧ, Э,—5-X і Ю, Я,—6-X

УСЕ ТАЛЁНЫ, выданыя на дэфіцытныя тавары з магазыну

ЦЭНТР. КАМІСІІ ДАПАМОГІ ДЗЕЦЯМ

(Савецкая, 67)

сапраўдны па 29 верасьня г. г.

Пасьля гэтага часу талёны лічацца анулёванымі.

МАГІЛЕЎСКІ

ДАРОЖНА-БУДАЎНІЧЫ ТЭХНІКУМ

АБВЯШЧАЕ:

што прыём заяў па групе рабочых

працягнуты да 30 верасьня.

Да заявы патрэбна далучыць анкету і ўсе неабходныя дакументы, згодна даведніка НК Асьветы.

Пачатак заняткаў па першым курсе **5 кастрычніка**, на другім курсе—**І кастрычніка.**

Іспыты нясканчаўшым сямігодку—2 кастрычніка. Здача абавязковых работ па тэарытычных дысцыплінах для студэнтаў другога курсу 25 верасьня.

АДРАС: Магілеў, Леніньская вуліца, № 43.

Частка студэнтаў забясьпечваецца стыпэндыяй і інтэрнатам.

За начальніка тэхнікуму ПАЎЛАЎ.

Ільнапяньковаму аб'яднаньню ВСНГ БССР

ПАТРАБУЮЦЦА:

інжынэры-будаўнікі,
тэхнікі-мэханікі,
інжынэры-электрыкі,
тэхнікі-электрыкі,
інжынэры-мэханікі.

—) Зарплата па згодзе (—

Кватэрай забясьпечваюцца натурай.

Заявы з кароткім жыцьцяпісам і паказаньнем практычнага стажу накіроўваць па адрасе: г. Менск, пляц Волі, № 21-1, Аб'яднаньню Ільнапяньковай прамысловасьці ВСНГ БССР

Згубленыя і украдзеныя дакументы

лічыць несапраўднымі

Асабов. карт. Глікіна Д. Я., выд. Чавуск. РВК 1095
Чл. біл. саюзу СГЛР Парахонька І. І. 1096
Чл. бел. саюзу чыгуначн. Папі[illegible] Ф. Н. 1097
Парт. біл., вайск. кн., віза Павуціных Я. П. 1098
Вуч.-конск. кн. № 1777 Кажалуба Ф., выд. Нараўл. РВК 1099
Вайск. кн. № 1737 Бараша М. І., выд. Юравіцк. РВК 1100
Вайск. біл. Рыжкова А. А., выд. Чавуск. вайск. ст. 1101
Пашп., выд. Іркуцк. міліцыяй, даведка аб працы, даведка Іркуцк. ПРК Казерская А. К. 1102
Вуч.-конск. карт. № 588 Скопа А., выд. Чарэйск. РВК 1103
Вайск. біл., прафбіл., асаб. пасьведч. Майорова М. М. 1104
Накл. № 75402 Тамашова Т., выд. Тураўск. Лесбелам 1105
Чл. біл. саюзу СГЛР № 76660 Чэпуля А. 1106
Вайск. кн. Ціпкевіча М. А., выд. Бярэзін. РВК 1107
Мэтр.-вып., выд. Станькаўск. с.-с. Чуеўская В. А. 1108
Вуч.-конск. карт № 670 Захарэнка А. Я., выд. Лепельск. РВК 1109
Наявая кн. № 4076 Бондар[illegible] Т., выд. Бярэзін. спаж. т-вам 1110
Чл. біл. саюзу хэмікаў № 530 Смаляга П. 1111
Вайск. біл. Сківіцкага Р. А., выд. Капыльск. РВК 1112
Наявая кн. Навіцкага А. П., выд. Альбрэхт. спаж. т-вам 1113
Вайск. пасьведч. Прыбыткова А. А. 1114
Вайск. пасьведч. Навіцкага А. П., выд. Ноцаўск. ваенкаматам 1115
Каап. кн. № 2914 Гнедзенка Ю. Т., выд. Бягомльск. спаж. т-вам 1116
Пасьведч. з візай за № 60 Шепат[illegible], выд. Вітуніцк. с.-с. 1117
Вайск. біл. Ходаса І. І., выд. Удзенск. РВК 1118
Вуч.-конск. кн. Гарбарчука А. Д. 1119

Менск. Галоўлітбел 337.